Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Органа ... Саветаў БССР.

10 год...

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародзяе — 20 к. мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапкавай пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапкавай пасярод тэксту 1 р. — к. За радок шапкавай перад тэкстам 1 р. 50 к. Скідкі на 50 проц. дазволены. Зьвыш гэтага тэрміну бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГО'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 216 (2705) Субота, 21-га верасьня 1929 г.

154 кр. "Савецкая Беларусь" Одесса, Пастера 13, госуніверстан. публичн. библиотека. студв. сьнок. адзін экз.

БУДАЎНІЦТВА САЦЫЯЛІЗМУ І СУПЯРЭЧНАСЬЦІ РОСТУ

ДАКЛАД ТАВ. МОЛАТАВА НА ПЕРШАЙ МАСКОЎСКАЙ АБЛАСНОЙ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ 14-га ВЕРАСЬНЯ 1929 Г.

МІЖНАРОДНАЕ СТАНОВІШЧА І АСНОЎНЫЯ СУСЬВЕТНЫЯ СУПЯРЭЧНАСЬЦІ.

Капіталістычны сьвет і СССР.

Таварышы! Я глыбока ня буду закранаць гаспадарчых спраў, бо пытаньне аб асноўных пэрспэктывах пралетарскай рэвалюцыі заўсёды заставалася ў цэнтры нашай увагі. Ва ўмовах крызісу сусьветнага капіталізму, які ўсё абвастраецца, гэта пытаньне набывае асаблівае значэньне. Будаўніцтва сацыялізму ў СССР адбываецца ў такі пэрыяд, калі капіталістычны сьвет усё больш хістаецца, калі ў ім усё больш растуць і абвастраюцца руйнуючыя яго супярэчнасьці.

У сувязі з гэтым мы павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на наступныя паказаньні ў рэзалюцыі 10-га пленуму Выканаўчага Камітэту Камуністычнага Інтэрнацыяналу, а менавіта: „Ня гледзячы на жорсткую барацьбу ўнутры імпэрыялістычнага лягеру, асноўныя сусьветныя супярэчнасьці паміж капіталістычным сьветам і СССР, як дзьвюма прынцыпова супроцілегымі гаспапарча-палітычнымі сыстэмамі, усё больш абвастраюцца. Напады імпэрыялістаў на СССР зьяўляюцца галоўнай небясьпекаю. Нам важна канстатаваць ня толькі факт абвастрэньня асноўных супярэчнасьцяў у сучасным сусьветным разьвіцьці. Нам важна ўяўляць сабе тое, як-жа ў спраўднасьці складаюцца суадносіны паміж капіталістычным сьветам і СССР, якая пранікае ў новую стадыю (як вядома, партыя Макданальда ў прадвыбарчай кампаніі дала абіцаньне безадкладнага прызнаньня СССР). Аднак, прышоўшы да ўлады, ён таксама заняўся свае-асаблівымі „манэўрамі“. У друку апублікаваны дакументы, якімі за апошні пэрыяд абмяняліся ўрады СССР і Англіі. З іх мы бачылі, як ангельскі міністр замежных спраў спрабаваў, з прычыны абгаварэньня працэдуры перамоваў, яшчэ да прызнаньня СССР распачаць перамовы па сутнасьці спрэчных пытаньняў. Гэткім шляхам пан Гендэрсон хацеў, відавочна, паказаць, што ён даб'ецца ад бальшавікоў такіх уступак, якіх ня здолеў дабіцца кансэрватыўны ўрад. У даным выпадку пан Гендэрсон выступаў ня толькі як прадстаўнік ангельскай буржуазеі, але і як прадстаўнік усяго варожага СССР імпэрыялістычнага сьвету. Відавочна, пан Гендэрсон, жадаючы аказацца наперадзе буржуазных урадаў па часьці націску на СССР, рашыў папрабаваць дамагчыся такіх уступак ад СССР цаною аднаўленьня з ім дыпляматычных зносін, якіх да гэтага часу не ўдавалася дамагчыся ніводнай імпэрыялістычнай дзяржаве. Толькі гэтым можна тлумачыць тыя бязглуздыя „манэўры“, якія робіць за апошнія часы пан Гендэрсон. Яго запрашэньне дзеля абгаварэньня „найбольш хуткай працэдуры“ перамоваў, якое ён пасьля, пры спатканьні з тав. Даўгалеўскім, спрабаваў падмяніць перамовамі па сутнасьці спрэчных пытаньняў, можа быць зразумела толькі ў гэтай сувязі. Канешне, калі-б пан Гендэрсон дабіўся хоць частковага посьпеху ў гэтых адносінах, ён быўбы гэроем усяго імпэрыялістычнага сьвету. Але ў тым і справа, што гэта надзея падобна ўсяго толькі на мыльны пузыр. Толькі зараз кіруючыя колы Англіі як быццам усьвядомілі бясплённасьць гэтых мараў і мы маем ужо новую прапанову аб перамовах выключна па фармальных пытаньнях працэдуры. Гэта ня значыць, што ўсё іншае адпадае.

Гэта ня значыць, што на нашым шляху ня ставацца падводныя каменьні. Адно зразумела, што наша лінія ў пытаньні аб узаемаадносінах паміж капіталістычнымі сьветам і СССР. У сваю чаргу гэта абвастрэньне грунтуецца на характары разьвіцьця капіталістычнага сьвету, з адвага боку і СССР—з другога.

Канфлікт на УК чыгунцы і ўзаемаадносіны Англіі і СССР.

Сюды адносяцца, граней за ўсё, падзеі на Далёкім Усходзе. Я маю на ўвазе захоп УК чыгункі і далейшае разьвіцьцё савецка-кітайскага канфлікту. Захоп УК чыгункі, які адбыўся 10-га чэрвеня, зьяўляецца ня толькі разбойным актам, але і простай правакацыяй вайны. Пад яўна выдуманай прычынай барацьбы «з камуністычнай прапагандай» кітайскія імпэрыялісты сарвалі дагавор, заключаны ў 1924 г. паміж СССР і ўрадам Кітаю. Гэты захоп падрыхтоўваўся даўно. Імпэрыялістычныя дзяржавы, якія стаяць за сьпіной Мукдэна і Нанкіна, штурхалі кітайскую ўладу на гэты крок. Гэты грабежніцкі наскок быў зроблен з яўнай мэтаю справакаваць СССР на вайну. Упартасьць, якую мукдэнска-нанкінская ўлада выяўляла дасюль у канфлікце, ясна гаворыць, што за іх сьпіной стаяць больш магутныя імпэрыялістычныя сілы. Дыпляматычная гульня імпэрыялістычных урадаў навакол канфлікту на УК чыгунцы толькі падкрэсьліла іх удзел у харбінскай правакацыі.

Падзеі, аднак, паказалі, што замеры правакатараў вайны не ўдаліся. Імпэрыялісты, якія прайгралі стаўку на тое, каб паказаць СССР парушыцелем міру і зачынішчыкам вайны, спрабуюць паказаць міралюбівую пазіцыю Савецкага Саюзу, як слабасьць саветаў. Нарэшце, і гэта спроба зьяўляецца хоць і з другога боку такама правакацыяй вайны. Але і гэта стаўка імэпрыялістычных дзяржаў усё больш выкрываецца падзеямі, зьвязанымі з канфліктам на УК чыгунцы, дзякуючы цьвёрдай і прынцыпова паступовай пазіцыі савецкага ўраду. Заходнікі УК чыгункі зусім не адчуваюць сябе пераможцамі. Іх цяжкасьці ў сувязі з канфліктам узрастаюць з кожным днём. Распад чыгункі і бясспільле кітайскай адміністрацыі—чыгуначнай, адміністрацыйнай, вайсковай—у справе барацьбы з разрухай на УК чыгунцы ўсё больш павялічваецца.

З другога боку, палітыка савецкага ўраду ў канфлікце на УК чыгунцы ўваёй прынцыповай рашучасьцю забясьпечыла сабе ня толькі спачуваньне працоўных Савецкага Саюзу, але і ўсё большае спачуваньне, якое расьце сярод працоўных мас у іншых краінах. Між тым, Мукдэн і Нанкін прымушаны ўжываць жульніцкія манэўры дзеля прыкрыцьця сваіго бясспільля і хістаньняў. Як вы ведаеце, Мукдэн і Нанкін некалькі разоў зьвярталіся да СССР з прапановамі аб перамовах аб урэгуляваньні канфлікту. Фальш гэтых прапановаў савецкі ўрад сыстэматычна выкрывае. Савецкі ўрад згадзіўся абмежавацца толькі самымі мінімальнымі панярэднімі ўмовамі, дзеля таго, каб распачаць канфэрэнцыю па ўрэгуляваньню канфлікту. Як вядома, у гэтыя мінімальныя ўмовы ўваходзяць раней за ўсё безадкладнае назначэньне на УК чыгунку кіраўніка і яго намесьніка, якія высоўваюцца СССР ў адпаведнасьці з тым, што мела месца на падставе мукдэнска-пекінскай згоды да канфлікту. Бясспрэчнасьць гэтай умовы для ўладжаньня канфлікту, шляхам згоды відавочна. Аднак, мукдэнска-нанкінская ўлады даюць адпаведныя абіцаньні, а пасьля бяруць іх назад, выкрываючы гэтым усё вераломства сваёй палітыкі.

Такі-ж характар мае і апошняя прапанова Нанкіна аб безадкладным назначэньні па аднаму намесьніку кіраўніка ад СССР і Кітаю—прапанова, якою нанкінцы хочуць падмяніць дадзеную імі раней згоду на назначэньне савецкага кіраўніка і яго намесьніка. Вядома, што гэткія, з дазволу сказаць «манэўры» нанкінскага ўраду толькі б'юць па яго аўтарытэту.

Такім чынам, прыходзіцца сьцьвердзіць, што гэта палітыка Нанкіна і Мукдэна ні ў якой меры не ўтварае нават элемэнтарных прадпасылак для ўладжаньня канфлікту шляхам згоды.

А таму савецкі ўрад цьвёрда стаіць на занятай ім пазіцыі, якая азначае патрабаваньне забясьпечаньня мінімальных умоваў для скліку савецка-кітайскай канфэрэнцыі па ўрэгуляваньні канфлікту.

Наша пазіцыя выкрывае ўсіх правакатараў вайны і, разам з гэтым, азначае, што ўсякім спробам нападу СССР даваў і будзе даваць рашучы адпор. Часьці Чырвонай Армії паказалі ўжо не адзін прыклад стойкага адпору спробам бела-бандытаў і кітайскіх часьцей перайсьці нашу мяжу. Па новыя правакацыі белагвардзейцаў у Манчжурыі і на новыя напады кітайскіх мілітарыстаў мы здолеем адказаць з належнай цьвёрдасьцю і бязьлітаснасьцю.

У свой час савецкі ўрад, у процілегласьць імпэрыялістам, якія маюць канцэсіі ў Кітаі, добраахвотна пашоў ня толькі на супольнае кіраваньне і на перадачу кітайскаму баку паловы чыгуначнай каляіны, якая належыць нашай дзяржаве, але таксама правёў на УК чыгунку і асноўныя мерапрыемствы, у адносінах рабочых і служачых, якія ажыцьцёўлены ў СССР (8-гадзінны рабочы дзень, ахова працы, будаўніцтва памяшканьняў, больніц і школ для рабочых і служачых і г. д.). Зараз савецкі ўрад дамагаецца ўсяго толькі аднаўленьня добрахвотна заключаных паміж СССР і Кітаем дагавораў 1924 году, злачына парушаных драпежным захопам.

Такая пазіцыя СССР цалком адпавядае ня толькі інтарэсам рабочае клясы нашай краіны, але і рабочай клясы Кітаю, а таксама інтарэсам усяго міжнароднага пралетарыяту. Важнейшай задачай нашай міжнароднай палітыкі ў гэтым выпадку зьяўляецца ўсямернае растлумачэньне шырокім масам СССР і працоўным усяго сьвету правільнасьці палітыкі савецкага ўраду і забясьпечаньне ўсё большага падтрыманьня іх з боку міжнароднага пралетарыяту; мы можам з упэўненасьцю сказаць, што палітыка, якая праводзіцца СССР адносна канфлікту на УК чыгунцы, поўнасьцю адпавядае гэтай задачы. У данай абстаноўцы гэта мае асаблівае значэньне з прычыны таго, што выкліканы захопам УК чыгункі канфлікт на справе адбівае сабой рост супярэчнасьцяў і абвастрэньне барацьбы паміж імпэрыялістычным сьветам і СССР, якія ўсё ўзрастаюць.

Канфлікт на УК чыгунцы гэта ня толькі і нават ня столькі канфлікт паміж Савецкім Саюзам і кітайскімі мілітарыстамі, колькі адзін з буйных момантаў барацьбы імпэрыялістычных дзяржаў супроць СССР. Гэты канфлікт адбівае сабой той паказаны вышэй факт, што ў цэнтры міжнародных супярэчнасьцяў усё больш становіцца асноўная супярэчнасьці паміж прынцыпова супроцілеглымі гаспадарча-палітычнымі сыстэмамі—паміж капіталістычным сьветам і СССР. З гэтага пункту гледжаньня мы павінны паглядзець і на ўзаемаадносіны СССР з Англіяй. З прыходам да ўлады ўраду рабочай партыі ў Англіі пытаньне аб узаемаадносінах з СССР павінна было ўступіць у новую стадыю (як вядома, партыя Макданальда ў прадвыбарчай кампаніі дала абіцаньне безадкладнага прызнаньня СССР). Аднак, прышоўшы да ўлады, ён таксама заняўся свае-асаблівымі „манэўрамі“. У друку апублікаваны дакументы, якімі за апошні пэрыяд абмяняліся ўрады СССР і Англіі. З іх мы бачылі, як ангельскі міністр замежных спраў спрабаваў, з прычыны абгаварэньня працэдуры перамоваў, яшчэ да прызнаньня СССР распачаць перамовы па сутнасьці спрэчных пытаньняў. Гэткім шляхам пан Гендэрсон хацеў, відавочна, паказаць, што ён даб'ецца ад бальшавікоў такіх уступак, якіх ня здолеў дабіцца кансэрватыўны ўрад. У даным выпадку пан Гендэрсон выступаў ня толькі як прадстаўнік ангельскай буржуазеі, але і як прадстаўнік усяго варожага СССР імпэрыялістычнага сьвету. Відавочна, пан Гендэрсон, жадаючы аказацца наперадзе буржуазных урадаў па часьці націску на СССР, рашыў папрабаваць дамагчыся такіх уступак ад СССР цаною аднаўленьня з ім дыпляматычных зносін, якіх да гэтага часу не ўдавалася дамагчыся ніводнай імпэрыялістычнай дзяржаве. Толькі гэтым можна тлумачыць тыя бязглуздыя „манэўры“, якія робіць за апошнія часы пан Гендэрсон. Яго запрашэньне дзеля абгаварэньня „найбольш хуткай працэдуры“ перамоваў, якое ён пасьля, пры спатканьні з тав. Даўгалеўскім, спрабаваў падмяніць перамовамі па сутнасьці спрэчных пытаньняў, можа быць зразумела толькі ў гэтай сувязі. Канешне, калі-б пан Гендэрсон дабіўся хоць частковага посьпеху ў гэтых адносінах, ён быўбы гэроем усяго імпэрыялістычнага сьвету. Але ў тым і справа, што гэта надзея падобна ўсяго толькі на мыльны пузыр. Толькі зараз кіруючыя колы Англіі як быццам усьвядомілі бясплённасьць гэтых мараў і мы маем ужо новую прапанову аб перамовах выключна па фармальных пытаньнях працэдуры. Гэта ня значыць, што ўсё іншае адпадае.

Гэта ня значыць, што на нашым шляху ня ставацца падводныя каменьні. Адно зразумела, што наша лінія ў пытаньні аб узаемаадносінах

Аб „раўнавазе“ Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў і „адносінах“ да СССР.

Перайду зараз—на прыкладзе Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў—да характарыстыкі разьвіцьця ПАЗШ—наймагутнейшай і паўнапраўнай капіталістычнай краіны. Аналіз эканамічнага разьвіцьця гэтай краіны мае асабліва важнае значэньне. У сувязі з гэтым мне прыдзецца спыніцца на аднэй кніжцы, якая выйшла ў маі месяцы ў Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатах. Я маю на ўвазе справаздачу ўрадавага камітэту, на чале якога стаіць Вэрдэрс Гувэр, цяперашні прэзыдэнт ПАЗШ. Гэты камітэт, у які ўваходзілі, апроч В. Гувэра, такія выдатныя амэрыканскія дзеячы, як Оўэн Юнг (аўтар вядомага «пляну Юнга»), Юльян Грын (старшыня амэрыканскай фэдэрацыі працы), буйнейшыя банкіры, прафэсары, адвакаты і інш., выдаў двохтомныя досьледы пад загалоўкам—„Апошнія зьмены ў эканоміцы ПАЗШ“. Гэтыя досьледы даюць апісаньні эканамічнага разьвіцьця ПАЗШ за пэрыяд з 1922 да пачатку 1929 году і, прымаючы пад увагу вялікую кампэтэнтнасьць аўтара ў справах амэрыканскай эканомікі, заслугоўваюць неадкладнага пераводу на расійскую мову. Пры ўсіх сур'ёзных недахопах кніжкі, якая зьяўляецца лішнім прадуктам буржуазнай творчасьці, у ёй шмат важных матар'ялаў і яна зьмяшчае ня мала навучальнага. У далейшым я спынюся на асноўным вывадзе гэтай кніжкі. Спачатку, аднак, пазнаёмлю вас у некалькіх словах са зьместам пададзеных у ёй двух лінатыпных табліц. У гэтых табліцах даецца агляд эканамічнага становішча 17 буйнейшых краін за гады 1919-21 (першая табліца) і за гады з 1922-27 (другая табліца). У ліку 17 краін, на чале якіх паўстаўлены ПАЗШ, ёсьць усе важнейшыя капіталістычныя дзяржавы, а менавіта: Англія, Францыя, Нямеччына, Італія, Японія, Кітай, Індыя і г. д. У табліцах адведзена месца і для „Расіі“, зразумела, у апошняй графе. У гэтых табліцах дадзены ў зусім кароткіх выразах характарыстыкі эканамічнага становішча пералічаных краін па асобных гадох і нават па паўгодзьдзях (амаль усёй зямной кулі).

Тут і аб СССР («Расія»). У першай табліцы, у адпаведных графах для кожнага году (1919, 1920, 1921), каротка і выразна зазначана — «дэпрэсія». У наступныя гады малюнак зьмяняецца, а менавіта: 1922 год—„дэпрэсія“, „ажыўленьне“; 1923 год—„ажыўленьне“, „зьніжэньне“; 1924 год—„дэпрэсія“, „ажыўленьне“, 1925 год—„росквіт», „зьніжэньне“; 1926 год—„росквіт“; 1927 год—„росквіт“. З тых-жа табліц відаць, што толькі ў адносіне двух краін — Канады і Аўстраліі—для 1926-27 году таксама безагаворачна паказана „росквіт“.

Ня шкодзіць пры гэтым адзначыць, што за апошні час у адносінах Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў у гэтых табліцах паведамляецца наступнае: 1925 год — „росквіт“; 1926 год—„росквіт“, „невялікае зьніжэньне“; 1927 год „умераная сьціснутасьць“. Такім чынам, шапоўны камітэт пана Гувэра і кампаніі сьведчыць у сваім досьледзе, што ў 1926-1927 гадох у СССР пачаўся „росквіт“ („простэрысі“), чым не маглі пахваліцца хоць-бы тыя-ж ПАЗШ.

У адносінах шэрагу іншых краін зазначаецца за тыя-ж гады проста на дэпрэсіі, часам нават у працягу доўгага шэрагу гадоў. Паказаныя вышэй „бесстароннія“ сьведчаньні Гувэраўскага камітэту аб „простэрысі“ ў СССР мы ня можам не адзначыць з поўным здавальненьнем, паколькі гэта гаворыць правадары варожай нам імпэрыялістычнай дзяржавы. Ня шкодзіць таксама параўнаць гэтыя сьведчаньні нашых ворагаў з лямантам правых аб „дэградацыі“. Але хопіць пра гэта.

Пераходжу да асноўнага вываду, які робіць камітэт Гувэра ў сваёй кароткай справаздачы, зьмешчанай у пачатку кніжкі. „Хоць мы перажылі пэрыяд—чытаем мы ў справаздачы—вялікай эканамічнай актыўнасьці і прамысловай вытворчасьці і дасягнулі такой ступені эканамічнага росквіту, які павінен быць вельмі высока ацэнен, калі ўлічыць рэарганізацыю ва ўсіх галінах эканамічнага жыцьця..., але мы ня можам захаваць нашы эканамічныя перавагі ці поўнасьцю разьлічваць на рэалізацыю нашай эканамічнай будучыні, калі мы ня ўявім сьвядома прынцыпу раўнавагі і ня будзем мастацкі ўжываць яго ва ўсіх эканамічных адносінах“. Далей там гаворыцца наступнае: „Наша складаная і заблытаная эканамічная машына можа вытварацъ, але для таго, каб яна вытварала бязупынна, яе неабходна падтрымліваць у раўнавазе. У працягу апошніх некалькі гадоў раўнавага падтрымлівалася вусім добра. Мы нятраціл дарэмна рабочых гадзін у забастоўках або лёкаутах. Аж да пядаўняга часу мы не аддзявалі зьберажэньняў з вытворчых вобласьцяў дзяржавы. Паміж эканамічнымі сіламі была раўнавага—ня поўная раўнавага, але такая ступень раўнавагі, якая давала магчымасьць складанай машыне вытвараць і **сачыць за нашымі народамі**... Здавалася-б, што мы можам ісьці наперад з узрастаючай актыўнасьцю. Але мы можам гэта рабіць толькі ў тым выпадку, калі мы перавысім тэхніку раўнавагі. Камітэт дапушчае, што 'мастацкая работа эканамістаў, інжынэраў і статыстыкаў, што падрыхтоўвалі досьлед, на якім мы грунтуем факты і тлумачэньні, выкладзеныя ў гэтай кароткай справаздачы, будзе спрыяць такой тэхніцы“.

Трэба было больш падрабязна спыніцца на пададзеных разважаньнях, але тут прыдзецца абмежавацца толькі галоўным—спыніцца на разважаньнях аб „раўнавазе“. Гэтыя разважаньні аб „раўнавазе“, аб „прынцыпе раўнавагі“, аб „тэхніцы раўнавагі“ заслугоўваюць вялікай увагі. Камітэт банкіраў, буржуазных прафэсароў і палітыкаў імпэрыялістаў вельмі пераканаўча даводзіць, што ў сучасных умовах нельга захаваць эканамічнае разьвіцьцё ў Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў, калі ня будзе сьвядома праводзіцца і мастацкі ўжывацца ва ўсіх эканамічных адносінах „прынцып раўнавагі“. Яшчэ больш цікава тое, якім чынам камітэт падыходзіць да задачы практычнага правядзеньня гэтага „прынцыпу раўнавагі“. Аказваецца, што нібы та ўся справа ў тым, каб разьвіць „тэхніку раўнавагі“. Камітэт спадзяецца, што «мастацкая работа эканамістаў, інжынэраў і статыстыкаў якія працавалі над складаньнем матар'ялаў і заключэньняў да справаздачы камітэту, будзе спрыяць такой тэхніцы». Такім чынам, камітэт выказвае надзею, што эканамісты, інжынэры і статыстыкі ПАЗШ настолькі распрацуюць патрэбную амэрыканскаму капіталізму «тэхніку раўнавагі», што ПАЗШ змогуць і далей ісьці па шляху капіталістычнага „прастэрысі“ („росквіт“). Але ня трудна заўважыць, што ў туманных сказах аб „тэхніцы раўнавагі“ паны амэрыканскія банкіры, капіталісты і буржуазныя палітыкі спрабуюць толькі схаваць сваю трывогу за лёс амэрыканскага капіталізму.

Але дасягненьне эканамічнай раўнавагі для капіталізму і фінансавага капіталу не супакойвае. Нездарма панянёная справаздача канчаецца ў вельмі мірным тоне. Мары аб эканамічнай раўнавазе пры капіталізьме ня могуць не разьлятацца пры першым сутыканьні з жыцьцём. Урэшце, гэта—мары аб «арганізаваным капіталізьме», якога на сьвеце ня было і быць ня можа. Безнадзейнае блытаньне банкіраў і буржуазных палітыкаў вакол пытаньня аб „эканамічнай раўнавазе“ толькі падкрэсьлівае, што капіталізм сябе зжыў, што ёсьць толькі адзін выхад да рэальнага ажыцьцяўленьня м а р а ў аб «раўнавазе»: нізрынуцьцё капіталізму і пераход да плянавай сацыялістычнай гаспадаркі. Мары аб выпрацоўцы пляну „тэхнікі раўнавагі“ ёсьць нішто іншае, як пустая ілюзія наконт плянавай гаспадаркі ў умовах капіталістычнай анархіі, якая ўсё больш абвастрае супярэчнасьці паміж узрастаючымі вытворчымі сіламі і буржуазнай грамадой, якая асуджае масы на ўсё большае пагоршаньне матар'яльных і іншых умоў іх жыцьця. Той факт, што СССР ужо ня першы год пасьпяхова праводзіць намечаныя ім эканамічныя пляны, і што зараз мы перайшлі да ажыцьцяўленьня пяцігодкі, ня можа не ўзмацняць у пануючых буржуазных клясах імкненьня аўладаць капіталістычнай стыхіяй, «арганізаваць» капіталістычную анархію. Вывады камітэту амаль з поўнай супярэчнасьцю і выразнай бездапаможнасьцю лішні раз паказваюць бясьсільле капіталізму ажыцьцёвіць „прынцып раўнавагі“. Гэтыя натугі паноў Гувэраў, О. Юнга, Грына і інш. з выключнай яскравасьцю сьведчаць аб тым, што капіталістычны сьвет усё больш заблытваецца ў сваіх супярэчнасьцях, што крызіс капіталізму ўсё больш паглыбляецца, што капіталізм ня можа знайсьці выхаду і ўсё шчыльней падходзіць да моманту свайго поўнага краху. І ствараецца гэта якраз у той момант, калі краіна, якая, будуе сацыялізм — СССР,—пераможна адраджаецца на аснове ўзмацненьня плянавага сацыялістычнага будаўніцтва. Справаздачна гувэраўскага камітэту вусім навочна пацьвярджае гэты асноўны вывад, які грунтуецца на марксыцка-ленінскім аналізе разьвіцьця капіталізму.

Рост супярэчнасьцяў у сыстэме капіталізму за апошнія гады ідзе асабліва шпаркім тэмпам. Абвастрэньне ў сучасны пэрыяд клясавых супярэчнасьцяў у капітаўістычным сьвеце адбываецца ў такой ступені, калі належыць канстатаваць нарастаньне новага рэвалюцыйнага ўздыму ў рабочым руху капіталістычных краін, а таксама калёніях, дзе сьпеюць сілы рэвалюцыйна-вызваленчай барацьбы супроць імпэрыялізму. Аб гэтым амаль з поўнай выразнасьцю сказаў апошні пленум Выканкому Камінтэрну.

Далей тав. Молатаў спыняецца на пытаньні аб росьце клясавых супярэчнасьцяў у буржуазных краінах. Ён гаворыць аб пагоршаньні эканамічнага становішча рабочай клясы і аб росьце супраціўленьня рабочых наступу капіталу, у тым ліку і ў калёніях. Канкрэтнымі прыкладамі дакладчык ілюструе думку аб тым, што новы рэвалюцыйны ўздым рабочага руху мае сапраўдны міжнародны характар. Пасьля тав. Молатаў пераходзіць да ацэнкі ролі сацыял-дэмакратыі.

Аб ролі сацыял-дэмакратыі.

У гэтых умовах сацыял-дэмакратыя пераходзіць усё больш адкрыта на бок імпэрыялізму. Гэта цалкам пацьвярджаецца прыходам да ўлады партыі 2-га Інтэрнацыяналу ў Нямеччыне і Англіі. Ня гледзячы на тое, што нямецкая сацыял-дэмакратыя мае ў парляманце толькі каля аднэй трэці мандатаў, а ангельская рабочая партыя—менш паловы, вось ужо другі год як у Нямеччыне існуе ўрад, на чале якога стаяць сацыял-дэмакраты з Мюльлерам, а ў Англіі буржуазныя партыі, якія маюць парляманцкую большасьць, дапускаюць існаваньне „рабочага“ ўраду на чале з Макданальдам. Мабыць буржуазея мае ўсе падставы давяраць такім партыям, як сацыял-дэмакратыя ў Нямеччыне, як рабочая партыя ў Англіі. Буржуазеі выгадна ў даны момант стаць да мас такім чынам, каб яе твар выглядаў „рабочым“, «дэмакратычным», «пацыфісцкім». Буржуазея не баіцца «сацыялізму» паноў Мюльлераў. Яна не баіцца „рабочай улады“ паноў Макданальдаў. Затое ёй патрэбны пацыфісцкі пыл, які пускаецца гэтымі панамі ў вочы рабочых і ўсіх працоўных сваіх краін. За апошні час павялічылася колькасьць пацыфісцкіх праэктаў. Такім чынам, яны спрабуюць прыкрыць новую імпэрыялістычную вайну і інтэрвэнцыю супроць СССР, якая падтрымліваецца за кулісамі. Найбольш стараецца ўрад Францыі на чале з панам Брыянам. Яго праэкт наконт Злучаных Штатаў Эўропы, відаць, мае мэтай перагнаць пацыфісцкую праграму сацыял-імпэрыялістаў, якія стаяць на чале ўрадаў Нямеччыны і Англіі. На справе праэкт Брыяна ўяўляе сабой імпэрыялістычную праграму самай магутнай у Эўропе капіталістычнай краіны, якая імкнецца адмежавацца ад паўночна-амэрыканскай канкурэнцыі і, у яшчэ большай меры, імкнецца да ўтварэньня адзінага фронту імпэрыялістаў Эўропы супроць СССР.

Аднак, вынікі Гаагі досыць яскрава гаворацъ, наколькі імпэрыялісты пяздольны вырашаць супярэчнасьці ў сваім асяродку. Гаагская канфэрэнцыя, якая займалася разглядам так званага пляну Юнга, зьяўляецца тыповым прыкладам натугі імпэрыялістаў разьвязаць супярэчнасьці капіталістычнага разьвіцьця, што ўвесь час паглыбляюцца. Амаль кожны з урадаў, якія прымалі ўдзел у перамовах, паказваюць вынікі Гаагі, як свае перамогі. Асабліва вялікі шум быў узьняты вакол «перамогі» Споўдэна, якая вырвала Англіі сваім націскам на іншыя краіны 36 мільёнаў марак дадатковых пляцяжоў. Споўдэн і ўрад Макданальда заслужылі вялікай ухвалы з боку ўсёй ангельскай буржуазеі за гэты „посьпех“ у Гаазе. Міністр фінансаў «рабочага» ўраду сапраўды пастараўся для сваёй буржуазеі. Асабліва - ж гэтай «перамогай» задаволен сэнат, бо яна ня можа не пацягнуць за сабой новых і сапраўды значных цяжкасьцяў для ўраду Макданальда. Нездарма „Тан“ зазначае на тое, што Англія рызыкуе стварыць сур'ёзныя нявыгоды ў палітыцы Вялікабрытаніі, калі атмасфэра ўтворанай Споўдэнам, прывядзе да падрыву ангельска-французкае згоды. «Перамога» Споўдэна ў Гаазе ня можа ня весьці да некаторай перагрупоўкі ў імпэрыялістычным лягэры і яшчэ лішні раз падкрэсьлівае ўсю няўстойлівасьць узаемаадносін паміж імпэрыялістычнымі дзяржавамі ў пан-Эўропе, не гаворачы ўжо аб іх узаемаадносінах з неэўрапейскім капіталістычным сьветам. Магчыма, што вынікі „перамогі“ ўраду Макданальда ў Гаазе зазьвіняць у кішэнях лёнданскіх банкіраў, але гэта «перамога“ ў кожным выпадку ня створыць умоў нават для нязначнага палепшаньня становішча рабочых.

Партыі другога Інтэрнацыяналу, якія стаяць ля ўлады ў Англіі і Нямеччыне, нічога ня робяць для палепшаньня становішча рабочых мас. Разам з тым, буржуазія скарыстоўвае іх шляхам прыцягненьня ўраду для далейшага паходу на рабочую клясу і для пашырэньня фашысцкіх мэтадаў барацьбы супроць рабочых. Прыкладам такога падыходу зьяўляецца пагоршаньне законаў аб страхаваньні беспрацоўных, якое праводзіцца зараз у Нямечыне сацыял-дэмакратычным міністрам працы Віссэлем. З другога боку, некалькі раней сацыял-дэмакратычны паліцэй-прэзыдэнт Бэрліну Цэргібэль у майскія дні правёў прыкладную, нават з пункту погляду фашыстаў, расправу з рабочымі. Сацыял-дэмакратыя шпарка ідзе на шляху фашызацыі. Нават у Аўстрыі так званая „левая“ сацыял-дэмакратыя на справе знаходзіцца ў саюзе з фашыстамі. У той момант, калі фашысты сьпешна рыхтуюцца да перавароту, „левыя“ сацыял-дэмакраты, на чале з Бауэрам, не знаходзяць нічога лепшага, як займацца балбатнёй аб „абодвабаковым разброеньні“ рабочых і фашыстаў. Апошнія скарыстоўваюць гэту балбатню як выгодную для сябе адстаўку, і правядзяць далейшае ўзброеньне. Такая палітыка сацыял-дэмакратыі, якая расчышчае дарогу фашысцкаму перавароту, ня можа ня выклікаць усё большага абурэньня рабочых мас. Поўны крах сацыял-дэмакратычнай палітыкі выяўляецца зараз з урастаючай шпаркасьцю.

Далей тав. Молатаў дае характарыстыку становішча ў Камінтэрне і ў яго асобных секцыях і гэтым заканчвае першую частку дакладу, прысьвечаную пытаньням міжнароднага становішча.

УНУТРАНАЕ СТАНОВІШЧА І НАШЫ ЗАДАЧЫ

Пэрспэктывы будаўніцтва і тэхнічная база.

Зараз сваечасова напомніць тое, што казаў Ленін на XI-м зьезьдзе партыі аб тагочасным становішчы і пэрспэктывах сацыялістычнага будаўніцтва СССР. Тады Ленін так акрэсьліваў нашу задачу: „Унікаць канфлікту з сялянскай масай, з радавым сялянствам і пачаць пасоўвацца наперад нязьмерна павольней, чымся да гэтага часу, але затое так, што сапраўды будзе рухацца ўся маса з намі. Тады паскораньне ўсяго руху ў свой час „настане такое, аб якім мы зараз і марыць ня можам“.

Сапраўды, у першыя гады НЭП'у гаспадарка СССР, калі яе ўзяць у цэлым, аднаўлялася марудна. Асабліва тут трэба мець на ўвазе вёску, дзе і зараз мы яшчэ не дасягнулі нават даваенных разьмераў прадукцыі, напрыклад, па зернавых культурах. Але зараз ужо можна сказаць, што мы пачынаем лічыць такую паласу разьвіцьця савецкай гаспадаркі, пра якую Ленін казаў у канцы пададзенай мною вытрымкі, калі рух наперад пачынае набываць такі тэмп, аб якім мы і марыць не маглі ў 1922 г.

Канешне, мы яшчэ толькі пачынаем—ня больш, чым толькі пачынаем,—уступаць у гэты пэрыяд. Аб гэтым сьведчыць наш пераход да сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі і ў далейшым перад намі адкрываюцца тыя пэрспэктывы, аб якіх у часе XI-га зьезду, водлуг слоў Леніна, мы не маглі яшчэ і марыць.

Далей дакладчык дае кароткую характарыстыку зьмен пяцігодкі ў бок далейшага пашырэньня, якія вызначыліся ў апошнія месяцы.

Цікава далей адзначыць, што ў ацэнцы нашага гаспадарчага разьвіцьця ў буржуазным лягеры пачынаюць выяўляцца новыя ноткі. Вось, напрыклад, як ацэньвае журналіст буйнай буржуазнай газэты „Бэрлінэр Тагеблят“ (ад 12 чэрвеня) нашу пяцігодку: «Гэта найвялікшы і ў шмат якіх адносінах самы сучасны эканамічны экспэрымэнт; ён ня толькі першы, але самы арыгінальны. Бедная старая Эў

БУДАЎНІЦТВА САЦЫЯЛІЗМУ І СУПЯРЭЧНАСЬЦІ РОСТУ

Даклад тав. Молатава на першай Маскоўскай абласной партканфэрэнцыі 14-га верасьня 1929 г.*)

...знаў кілёват. Калі мне давялося ўспамінуць аб досьледзе эканомікі Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў, то ня менш важна зазначыць, што два томы прац ЦСУ, якія вышлі па пытаньнях так званага энэрга-балянсу, набываюць асаблівае значэньне сярод усіх прац па пяцігадоваму пляну. Я маю на ўвазе выданьне пад рэдакцыяй тав. М. Сьміта два выпускі надзвычайна важных прац, якімі кіраваў інжынэр-эканаміст, тав. В. І. Вэйц, а менавіта: а) Пабудаваньне і работа моцнага апарату, энэргэтычны і апалавы балянс і б) „Рацыяналізацыя прамысловай энэргетыкі СССР". У дзьвюх гэтых вялізарных кнігах ідзе досьлед важнейшага для гаспадарчага разьвіцьця СССР пытаньня аб энэрга-ўзброенасьці нашай прамысловасьці. З параўнаньня зьмешчаных тут даных з матар'ялямі пяцігадовага пляну відаць, што, у параўнаньні з 1925 г. канца пяцігодкі (1932-33 г.) скарыстаньне мэханічнай і электрычнай энэргіі прамысловасьцю ў нас расьце, прыкладна, у 3 з пал. разы, пры гэтым каэфіцыент (прамысловасьці) электрафікацыі павысіцца з 48 да 82 проц. Асабліва гэта важна адзначыць, што так званая энэрга-ўзброенасьць рабочага на вытворчасьці за той жа пэрыяд узрасьце ў 2 з пал. разы і цікава параўнаць, наколькі павялічваецца энэрга-ўзброенасьць рабочага ў нашай краіне, у параўнаньні, напрыклад, з Паўночна-Амэрыканскімі Злучанымі Штатамі, самай перадавой у гэтых адносінах краінай. Выяўляецца, што нават у канцы пяцігодкі энэрга-ўзброенасьць савецкага рабочага будзе ніжэй энэрга-ўзброенасьці амэрыканскага рабочага ў 1925 г. Аднак, калі за 1926-27 г. энэрга-ўзброенасьць амэрыканскага рабочага узрасла на 20,5 проц., г. зн. крыху больш, чымся на 10 проц. за год, дык сярэдні штогадовы прырост энэрга-ўзброенасьці на аднаго савецкага рабочага будзе дасягаць прыкладна, 36 проц.

Вось гэта і значыць, што ў самым асноўным для разьвіцьця гаспадаркі — у справе яе энэрга-ўзброенасьці — мы сапраўды будзем даганяць нават гэткую перадавую па тэхніцы краіну, як Паўночна Амэрыканскія Злучаныя Штаты. У пытаньні аб ажыцьцяўленьні лёзунгу «дагнаць і перагнаць» капіталістычныя краіны мы за апошнія часы зрабілі яшчэ адзін вельмі вялікі крок. Рашэньне аб пераходзе на бесьперапынную вытворчасьць набывае ў гэтых адносінах вялізарнае значэньне. Гэта мерапрыёмства дае СССР вялікую перавагу ў справе паскарэньня гаспадарчага разьвіцьця, утвараючы для разьвіцьця нашай прамысловасьці гэткія спрыяючыя ўмовы, якіх капіталістычныя краіны ня маюць і мець ня могуць.

Далей тав. Молатаў спыняецца на наступных пытаньнях: аб зьніжэньні сабекошту і аб прадукцыйнасьці працы; аб ходзе сацыялістычнага спаборніцтва; нарэшце, на мерапрыёмствах, накіраваных да ўпарадкаваньня ня кіраўніцтва вытворчасьцю.

Пераходзячы да пытаньняў сельскае гаспадаркі, дакладчык прыводзіць шэраг даных, якія характарызуюць шпаркі рост аграмаджанага сэктару, асабліва калгасаў.

— Якія буйныя зьмены ў разьвіцьці сельскае гаспадаркі ўносяць апошнія посьпехі савгаснага і калгаснага будаўніцтва,— гаворыць далей тав. Молатаў, можна зараз бачыць нават з шэрагу заяў прадстаўнікоў буржуазнага сьвету, якія мелі магчымасьць азнаёміцца з фактамі. Прывяду некалькі вытрымак з дзьвюх замежных газэт па гэтаму пытаньню: найперы прывяду цытату з карэспандэнцыі з Масквы пана М. Арксона, надрукаваную 24-га жніўня ў амэрыканскай газэце „Чыкага Дэйлі Ньюс". Пан Арксон піша: „Сьвет прывык атрымоўваць з Савецкай Расіі зьвесткі, якія зьбіваюць з панталыку. Але нішто ня можа выклікаць большага зьдзіўленьня, бадай, патрасеньня чымся рост калектыўнай сельскай гаспадаркі, які разьвіваецца зараз з такою хуткасьцю, што калі цяперашні тэмп будзе захаваны, дык ён хутка будзе рашаючым у рэарганізацыі сельска-гаспадарчай эканомікі, а бадай, нават і палітычнага становішча Савецкага Саюзу". Так гаворыць карэспандэнт аднэй з буйнейшых буржуазных газэт Амэрыкі.

А вось, што піша аб калектывізацыі карэспандэнт „Дэйлі Ньюс Геральд"—цэнтральны орган ангельскай рабочай партыі. Гэты карэспандэнт, пан Л. Фарбман, піша ў „Дэйлі Геральд" ад 29-га жніўня наступнае: «Пасьля некалькіх дзён я сам ужо здолеў адрозьніваць калгасныя палі ад індывідуальных—і ня толькі таму, што першыя выяўляюць бязупынную масу складаюцца з маленькіх вучасткаў зямлі, перарэзаных межамі, а галоўнае таму, што яны (калгасныя палі) лепш апрацаваны, пасевы на іх ураджайныя і што яны наогул выглядам сваім адрозьніваюцца ад звычайных сялянскіх палёў".

Кажучы аб становішчы ў вёсцы, трэба з асаблівай увагай адносіцца да факту абвастрэньня клясавай барацьбы ў сучасны момант. Рост савгасаў выклікае магутнае супраціўленьне кулацтва.

У райёне шырокай калектывізацыі гэта абвастрэньне часамі даходзіць да вельмі вострых форм барацьбы. Кулацтва спрабуе ўсякімі застрашваньнямі, правакацыямі перашкодзіць калгаснаму будаўніцтву, падарваць аўтарытэт партыі і савецкай улады,— адным словам, пакруціць кола назад. Але нічога з гэтага ня выходзіць. Супраціўленьне капіталістычных элемэнтаў павінна толькі ўзмацніць нашу энэргію ў справе сацыялістычнай перабудовы вёскі. За апошні час адзначаецца ў шэрагу райёнаў значнае ажыўленьне стачачнага руху батракоў. І што яны, як гэта адзначалася ў газэтах, некатарыя масы і прафсаюзныя арганізацыі ня толькі стаяць у баку, але і адмаўляюцца дапамагаць баступючым батракам (Аранбург). Але ў большасьці выпадкаў прафсаюзныя арганізацыі ў вёсцы ўжо пачынаюць блізка падыходзіць да батрацтва. З другога боку, мы маем некаторыя посьпехі ў справе арганізацыі беднаты. Вынікі агляду груп беднаты ў канцы мінулага году паказалі значны рост гэтых груп—праўда, у некаторых выпадках, напрыклад, у Разані, у гэтым годзе мы маем горшае. Але дырэктывы 15 партканфэрэнцыі да рашучага палепшаньня справы арганізацыі беднаты партыя мае па справе ажыцьцёвіць. Палепшаньне арганізацыі пралетарскіх і паўпралетарскіх элемэнтаў вёскі мае для нас у даны момант асабліва важнае значэньне. Але мы павінны памятаць аб тым, што пакуль прамысловыя рабочыя за плугі ня возьмуцца, ня возьмуцца за практычнае падтрыманьне справы калектывізацыі вёскі, нічога моцнага, нічога сапраўды надзейнага, нічога сапраўды сацыялістычнага ў будаўніцтве калгасаў, якія ахапляць шырокія бядняцка-серадняцкія масы—ня будзе. Гэта падтрыманьне рабочых даецца ў самых разнастайных формах партыйнымі арганізацыямі, прафсаюзамі камандыраванымі на правядзеньне асобных кампаній у вёсцы рабочымі і г. д. Але ўсяго гэтага недастаткова. Трэба шукаць новых форм і ўдзелу прамысловых рабочых у калектывізацыі сялянскай гаспадаркі. Некаторыя навіны ў гэтай галіне за апошні час ёсьць. Сюды, памойму, адносяцца такія акты, як дагаворы па загатоўцы сельска-гаспадарчых прадуктаў, утвораныя Маскоўскім Саюзам Спажывецкіх Таварыстваў (рабочай каапэрацыяй) з с.-г. каапэрацыяй Сярэдняй Волгі, Паўночнага Каўказу і Украіны. Праўда, гэты вопыт яшчэ вельмі недасканалы, але важны ўжо той факт, што некалькі дзесяткаў заводаў і фабрык Маскоўскай губэрні пачынаюць непасрэдна зьвязвацца з асобнымі сялянскімі райёнамі, напрыклад, на Волзе. Сюды-ж адносіцца ўтварэньне згоды паміж партыйнымі арганізацыямі Сярэдняй Азіі і Казакстану, з аднаго боку, і Маскоўскай, Ленінградзкай і Іванаўскай абласнымі арганізацыямі—з другога,— аб дапамозе і садзейнічаньні прамысловых арганізацый тэкстыльных райёнаў у разьвіцьці сацыялістычнай рэканструкцыі баваўнянай гаспадаркі Сярэдняй Азіі. Камандыроўка работнікаў пасылка рабочых брыгад і бязупынная сувязь фабрык і заводаў праз баваўняную каапэрацыю з дэкханамі Сярэдняй Азіі будуць мець вялікае значэньне для ажыцьцяўленьня задач сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі гэтых райёнаў

Аб харчовым пытаньні і аб зарплаце.

Цяпер трэба спыніцца на становішчы харчовых загатовак. Ажыцьцяўленьне гэтага пляну зусім магчыма прымаючы пад увагу параўнаўча добры ўраджай. Плян прадугледжвае выдзяленьне асобнага недатыкальнага фонду ў 100 мільёнаў пудоў хлеба ў якасьці аднэй з важнейшых гарантый устойлівасьці гаспадарчага разьвіцьця. Сёлета заданьне па хлебазагатоўчаму пляну даводзіцца да сяла. Пры гэтым плянавыя заданьні сёлам уключаюць спэцыяльныя заданьні для здачы хлеба асобнымі кулацкімі гаспадаркамі (выкананьне вызначанага хлебазагатоўчага пляну вымагае вялікага напружаньня сіл і зьяўляецца важнейшым элемэнтам гаспадарчага пляну). Вакол ажыцьцяўленьня гэтых заданьняў мы павінны згуртаваць бядняцка-серадняцкія масы. Ход загатовак паказвае, што пры наяўнасьці шэрагу істотных посьпехаў тая-ж справа з загатоўкамі харчовых культур ідзе недастатковым тэмпам. Праўда, па даных на першае верасьня, загатоўлена ўсіх культур 126 мільёнаў пудоў супроць 40 мілёнаў леташняго году і 80 мілёнаў пазалеташнага. У асноўным гэты плян застаецца і для першых пяцідзёвак верасьня. Аднак, загатоўкі харчовых культур адстаюць ад вызначанага пляну. Наколькі нашы пляны пры іх практычным перавядзеньні патрабуюць узмоцненай увагі да сябе, паказвае практыка кантрактацыі. У шэрагу выпадкаў, ня гледзячы на шырокія пляны кантрактацыі, ажыцьцяўленьне іх праводзіцца вельмі незадавальняюча. Вось што паведамляе адзін таварыш з месца хлебазагатовак. Ён піша: У Кахоцкім райёне Херсоншчыны ў сяле Любімаўка зямельнае таварыства № 2 закантрактавала 7.650 пудоў хлеба. Тэрмін здачы—1-е верасьня. Здадзена 450 пудоў, г. зн. каля 6-7 проц. Інакш кажучы, поўны зрыў і ніводнага прыцягненьня да адказнасьці, ніякіх мер". Спакойна адносіцца да такіх спраў зусім недапусьціма. Хлебазагатоўчая кампанія патрабуе да сябе ўзмоцненай увагі ўсіх партыйных арганізацый. Сёлета справа хлебазагатовак мы павінны аддаць сур'ёзную ўвагу, хоць і невялікія загатоўчыя пляны.

Гэтымі днямі ЦК ухваліў спэцыяльную пастанову, у якой зазначана на неабходнасьць падпарадкавацца па частцы хлебазагатовак такім абласным арганізацыям, як Маскоўская, Ніжагародзкая, Іванаўская, Ленінградзкая і Заходняя. Побач з гэтым нельга паслабіць увагу да справы снабжэньня. Увядзеньне заборных кніжак аказалася зусім правільным мерапрыёмствам, якое рабочыя поўнасьцю адабраюць. Гэта дало магчымасьць лепш паставіць забясьпечаньне рабочых хлебам і, разам з тым, дало значную эканомію ў яго расходваньні. Так, пры нармальным становішчы з дастаўкай хлеба ў прамысловыя райёны мы маем сёлета за ліпень-жнівень толькі па РСФСР ня менш 8 з палов. мільёнаў пудоў эканоміі ў параўнаньні з мінулым годам. Для аднэй Масквы за ліпень-жнівень-верасень гэта эканомія будзе звыш 9.00.000 пуд. У сучасны момант мае асаблівае значэньне палепшаньне арганізацыі дастаўкі рабочым іншых прадуктаў харчаваньня: мяса, масла, яек, малака. Відавочна, і тут трэба пайсьці па шляху скарыстаньня практыкі заборных кніжак. Гэта зараз зусім неабходна, асабліва ў сувязі з ненармальнасьцямі, выкліканымі чаргамі. ЦК надае вялікае значэньне правільнай пастаноўцы барацьбы з чаргамі і будзе дамагацца рашучага зьнішчэньня бюракратычных перашкод нармальнай арганізацыі дастаўкі рабочым і работніцам неабходных прадуктаў. Мы павінны зараз-жа ўжыць шэраг мер для таго, каб пазбавіцца чаргі за асноўнымі прадуктамі харчаваньня і на справе палепшыць забясьпечаньне імі рабочых.

Пытаньне аб зарплаце.

За бягучы гаспадарчы год намінальная зарплата павялічылася на 10 проц., замест 7 проц., якія меркаваліся, рэальная-ж зарплата павялічылася на 2-3 проц. Трэба адзначыць, што за бягучы год павялічыліся таксама адлічэньні ад прыбыткаў прамысловасьці ў фонд палепшаньня быту рабочых на 30 мільёнаў рублёў, што азначае ў сярэднім дадатковае падвышэньне зарплаты на 1 проц. Апроч таго, былі зроблены значныя асыгнаваньні (да 142 мільёнаў руб.) на жыльлёвае будаўніцтва. Бюджэт сацыяльнага страхаваньня павялічыўся на 177 мільёнаў руб. у наступным гаспадарчым годзе вызначана павялічэньне зарплаты ў сярэднім на 9 проц., пры ўмове падвышэньня вытворчасьці працы на 23 проц. Прадугледжваецца таксама зьніжэньне індэксу, бо гэта павінна даць далейшае значнае палепшаньне становішча рабочых мас і зьявіцца ўмовай да значнага падвышэньня вытворчасьці працы.

Аб кадрах.

Зараз пераходжу да праблемы кадраў. Чымся бліжэй мы падыходзім да гэтага пытаньня, тым хутчэй выкрываецца супярэчнасьць паміж нашымі патрэбамі і фактычным становішчам справы ў гэтай галіне. Ленін вучыў адносіцца з асаблівай увагай да справы выкарыстаньня старых тэхнічных і наогул культурных сіл. Ён вучыў таксама таму, каб камуністы падходзілі да іх працы з належнай крытыкай і праверкай. Зараз гэтыя паказаньні Леніна набываюць асаблівае значэньне. Грандыёзныя задачы рэканструкцыі гаспадаркі, ажыцьцяўленьне якіх ня можа неадбывацца ў даны момант, пры значным абвастрэньні клясавай барацьбы, барацьбы буржуазна-капіталістычных элемэнтаў супроць пралетарыяту, патрабуюць самага сур'ёзнага палепшаньня нашага дзяржапарату, перамаганьня шматлікіх элемэнтаў бюракратызму і шырокага прасоўваньня на працу ў дзяржорганы новых кадраў з рабочае клясы, у прыватнасьці, таварышоў, якія скончылі савецкія школы і ВНУ. Засьмечанасьць дзяржапарату чужымі пралетарыяту элемэнтамі прымусіла партыю распачаць сацыяльную чыстку дзяржапарату. Ня буду спыняцца падрабязна на гэтым пытаньні. Недахопы распачатай у гэтай галіне працы відавочны. Пастанова ЦК, якая адбылася нядаўна, зазначае на тое, што чыстка дзяржапарату павінна стаць справай усёй партыі, прафсаюзаў, рабочае клясы. У гэтай-жа пастанове зазначаецца на тое, што ў правядзеньні чысткі нельга раскідацца, што трэба на бліжэйшыя часы спыніцца толькі на абмежаванай колькасьці вучасткаў. Толькі пры гэтых умовах удасца як належыць правесьці гэту так патрэбную нам працу. Наконт асаблівай патрэбы гэтай чысткі можна было-б прывесьці шмат ілюстрацый, але я абмяжуюся толькі аднэй. У сувязі з гэтым вынікі чысткі апарату Акадэміі Навук у Ленінградзе павінны зьвярнуць на сябе вялікую ўвагу. Тут з 459 праверваных было зьнята з працы 78 чалавек. У ліку зьнятых з Акадэміі Навук ня мала „махровых" прадстаўнікоў былой царскай манархіі, „былых людзей". Сярод навуковых працаўнікоў, якія зараз зьняты за няпрыгоднасьцю іх, ва „ўдалай дзейнасьці" дзеля савецкай улады знаходзяцца гэткія асобы, як камэргер двара Мікалая II— Н. С. Фоль, былы губарнатар, былы дырэктар агульнага дэпартаманту міністэрства ўнутраных спраў Шымхевіч, які быў прысуджаны савецкай уладай да растрэлу за шантаж, які прымаў удзел у 1922 годзе ў сіёніцкай контр-рэвалюцыйнай тэрарыстычнай арганізацыі, Вержбіцкі, былы граф, гофмэйстр двару Мікалая II, і асабісты сэкратар Александры Фёдараўны—Я. М. Растоўцаў, дачка былога міністра ўнутраных спраў, былы асабісты сэкратар архіяпіскапа, які перайшоў на працу ў Акадэмію Навук са службы ў патрыарха Ціхона і г. д., і г. д. Вучоным сэкратаром бібліятэкі Акадэміі Навук быў нейкі Мархільтон, які з усіх твораў Леніна чуў толькі аб „Капітале". Вось якімі элемэнтамі засьмечаны быў апарат Акадэміі Навук.

Трэба дадаць да гэтага, што камісія, якая рабіла чыстку, з другога боку сьцьвярджае, што тыя, якія скончылі савецкія ВНУ і школы, скарыстоўваліся ў Акадэміі Навук у якасьці прыбіральніц, намесьнікаў швэйцара, курэраў і г. д. Мы нядаўна сьвяткавалі юбілей Акадэмі Навук. Але мы толькі зараз убачылі, з каго складаецца Акадэмія Навук. Так абстаіць справа з аднэй з важнейшых устаноў, апарат якой да апошняга часу падбіраўся, відавочна, ня з пункту погляду інтарэсаў савецкай улады. Мы павінны будзем з мятлой у руках заглянуць і яшчэ ў многія, занядбайныя ў сэнсе савецкага кантролю, куты нашага дзяржапарату.

Пры разглядзе пытаньня аб дзяржапараце ніяк нельга забываць і аб шкодніцтве з боку некаторых буржуазных спэцыялістаў, незамірыма варожых савецкай уладзе. Шахцінская справа была прыкладным вурокам для ўсіх нас, а асабліва для камуністаў-гаспадарнікаў, але гэты вурок да гэтага часу далёка ня ўсімі нашымі таварышамі сур'ёзна прадуманы. Між тым шкодніцтва ў нашым апараце мы выкрываем за апошнія часы на новых і новых вучастках.

Нядаўна было апублікавана паведамленьне АДПУ аб выкрыцьці шкодніцтва ў НК Шляхаў Зносін, а таксама ў залата-прамысловасьці і плятына-прамысловасьці. Контр-рэвалюцыйныя шкодніцкія арганізацыі былі выкрыты за апошнія часы і ў іншых галінах гаспадаркі. Нават у вайсковай прамысловасьці на працягу шэрагу гадоў працавала шайка белагвардзейцаў-падрыўнікаў з асяродзьдзя старых інжынэраў і генэралаў. Усё гэта гаворыць аб тым, што клясавая пільнасьць і дбайнасьць нашых працаўнікоў у шмат якіх выпадках яшчэ зусім невыстарчальныя". Між тым клясавы вораг у выглядзе рэшткі старых гаспадароў і некаторых буржуазных спэцыялістаў, якія нядольны парваць з мінулым, вельмі жывучы. Расстраляны нядаўна стары служака капіталу, былы намесьнік міністра гандлю і прамысловасьці ў урадзе Керанскага Пальчынскі, шчыра залвіў пры допыце АДПУ: «Я прызнаю, што мая палітычная пляцформа дзейнасьці і дысцыпліны за час існаваньня савецкай улады была яўна антыбальшавіцкай, а калі лічыць, што савецкая ўлада і дыктатура пралетарыяту, адно і тое-ж, дык і антысавецкай». У гэтым ганебным паказаньні пан Пальчынскі проста заяўляе ня толькі аб прынцыповай нязгодзе з савецкаю ўладаю, але і аб тым, што яго „дзейнасьць і выступленьне за час існаваньня савецкай улады былі яўна антыбальшавіцкімі і антысавецкімі „Між тым, гэты незамірымы вораг працоўных адыгрываў некаторы час відную ролю ў навукова-тэхнічнай радзе ВСНГ і быў адзін час старшынёю клюбу горных дзеячоў, выкарыстоўваючы, відавочна, гэты „клюб" для сваёй контр-рэвалюцыйнай работы.

З другога боку нам ня менш патрэбна ўпартая палітычная праца сярод масы старых кадраў. Асноўная маса гэтых кадраў працуе ў вогуле лёяльна для савецкай дзяржавы. Нашай задачай зьяўляецца дыфэрэнцыраваць сярод старых тэхнічных кадраў усё, каб выдзеліць з іх: а) актыўных, сьвядомых прыхільнікаў будаўніцтва—гэта будзе пакуль што меншасьць у гэтым асяродзьдзі; б) для плённай працы большасьці тэхнікаў і інжынэраў, якія лёяльна адносяцца да савецкай улады, хоць частка з іх і зараз яшчэ не расталася з буржуазнай ідэалёгіяй, якая падтрымлівае адмоўныя настроі ў адносінах да сацыялістычнага будаўніцтва, бязьлітасна караць сабатажнікаў і шкоднікаў, якія спрабуюць працягваць падрыўную працу ў гаспадарчых установах. Відную ролю ў гэтай справе хацела адыграць спэцыяльна ўтвораная па ініцыятыве беспартыйных інжынэраў і вучоных арганізацыя тэхнічных сіл Варнітсо. Аднак, яна выявілася настолькі малажыцьцёвай, што зараз мала хто можа сказаць, ці існуе яна на справе, ці толькі лічыцца ў сьпісу дабраахвотных арганізацый. У кожным разе прафсаюзы павінны яшчэ ў большай меры, чымся да гэтага часу, пасунуць наперад справу савецкай арганізацыі тэхнічных сіл, з захоўваньнем паказанага дэфэрэнцыраванага падыходу да гэтых кадраў.

Пытаньне аб адносінах да старых тэхнічных кадраў і наогул пытаньне аб адносінах да інтэлігенцыі зараз набыло новую вострасьць. Асаблівая важнасьць гэтага пытаньня зьвязана з клясавымі зрухамі ў краіне. Абвастрэньне барацьбы з сацыялістычным і капіталістычным элемэнтамі патрабуе ад тэхнічных кадраў і ад інтэлігенцыі цалком большай яснасьці іх грамадзкай пазіцыі.

Дыфэрэнцыяцыя сярод інтэлігенцыі, у прыватнасьці, у асяродзьдзі яе старых кадраў, узмацняецца.

За апошні час гэта знаходзіць адбітак у шэрагу новых, заслугоўваючых увагі, фактаў. Так, у літаратурных колах пачалася барацьба вакол пытаньня аб дапусьцімасьці для савецкіх пісьменьнікаў друкавацца ў замежных белагвардзейскіх выданьнях, чаго яшчэ нядаўна не назіралася. Зьмешчаная пісьменьнікам Б. Пільняком у эміграцкім бэрлінскім выданьні аповесьць „Красное Дерево" выклікала сярод пралетарскіх літаратараў цэлую буру пратэстаў.

У сувязі з гэтым пытаньнем—аб дапусьцімасьці для савецкага пісьменьніка друкавацца ў эміграцкіх выданьнях,—пачынае распаўсюджвацца думка аб утварэньні новых пісьменьніцкіх арганізацый. Здаецца, урэшце, зьявілася на сьвет фэдэрацыя савецкіх пісьменьнікаў, якая фармальна ўзьнікла амаль два гады таму назад. Можна толькі пажадаць, каб на барацьбе з антысавецкімі выступленьнямі, прасякнуты буржуазнай ідэалёгіяй пісьменьнікаў, сапраўды па савецку пачалі выхоўвацца нашы пісьменьніцкія кадры.

Нельга не адзначыць яшчэ аднаго зьявішча ў інтэлігенцкім асяродку. Сярод паасобных яго прадстаўнікоў, асабліва сярод працуючых над пытаньнямі сельскай гаспадаркі, зараз можна сустрэць адкрытыя выступленьні супроць палітыкі партыі і савецкай улады пад прыкрыцьцем заяў аб салідарнасьці з „правым ухілам". У нашых савецкіх органах і ВУЗ'ах ёсьць „дзеячы", якія спрабуюць праводзіць варожыя нашай лініі палітычныя тэндэнцыі, прыкрываючыся спасыланьнем на пляцформу правага ўхілу. Гэтыя людзі не разумеюць, што палітыка ЎсеКП(б) не сумяшчаецца з абаронай права-ўхілісцкай ідэалёгіі. Яны не разумеюць, што наша партыя вядзе незамірымую барацьбу з усялякімі тэндэнцыямі з права-ўхілісцкай ідэалёгіяй, бо гэта ідэалёгія, урэшце, зьяўляецца нічым іншым, як ідэалёгіяй адраджэньня капіталізму. Гэтыя людзі, мабыць, не разумеюць, што, паказваючы сябе адкрытымі прыхільнікамі „праваўхілісцкай" ідэалёгіі, прапаведваньне якой несумясьціма з прыналежнасьцю да кампартыі, яны на справе ўскрываюць сваё дробнабуржуазнае нутро. На гэтым прыкладзе відаць, што ўслякае змазваньне барацьбы з правай небясьпекай зьяўляецца на справе паслугаю меншавікам і эсэрам, якія спрабуюць узьняць галаву

Прыведзеныя прыклады павінны прымусіць нас усімі спосабамі ўзмацніць барацьбу з меншавіцка-эсэраўскімі ўплывамі ў рабоце нашых дзяржорганаў. За апошні час меншавіцка-эсэраўскія ўплывы, якія адбіваюць сабою націск кулака, нэпмана і буржуазнай інтэлігенцыі ў нашым дзяржапараце, пачалі больш яскрава выкрывацца. Гэта зьяўляецца ў вынікў ўсё таго-ж абвастрэньня барацьбы сацыялістычных і капіталістычных элемэнтаў. Адбіваецца-ж гэты націск нават у такой галіне, як наша статыстыка Вось пара прыкладаў у тым сэнсе.

Для вызначэньня нашага хлебазагатоўчага пляну нам неабходна пэўнае наліччa—статыстычная база—высокай ці дробнай сялянскай гаспадаркі, перш усяго ў яе зернавой частцы. Аднак, сур'ёзнай навукова-статыстычнай базы ў нас у гэтай галіне да гэтага часу няма. Адпаведныя статыстычныя работы ў шэрагу выпадкаў праводзіліся такім чынам, што на справе пібы „бесстароннія" лічбы нярэдка падганяліся пад буржуазна-кулацкія палітычныя вывады аўтара гэтых работ. У сувязі з гэтым пэўная частка працы нашай дзяржстастыстыкі зьяўляецца ў гэтых адносінах зусім беспадстаўнай.

Між тым, калі фармальна аднесьціся да гэтай статыстыкі і не крытычна абапірацца на вывады некаторых спэцаў, дык выходзіць, што сёлета мы павінны былі-б не павялічваць, а скарачаць—у параўнаньні з мінулым годам—наш плян хлебазагатовак. На шчасьце, наш бальшавіцкі вопыт у барацьбе з буржуазнымі ўплывамі ва ўсіх іх праявах, а таксама і наогул пасьпяховы ход хлебазагатовак даюць нам магчымасьць адкідаць у бок падтасаваныя пад буржуазную палітыку лічбы і на падставе вучоту шэрагу бясспрэчна ўстаноўленых момантаў у разьвіцьці вёскі, а таксама вопыту партыйных і іншых арганізацый і самой практыкі хлебазагатовак вырашаць пытаньні хлебазагатоўчага пляну наперакор асноўным вывадам буржуазна-кулацкіх ідэалёгаў, якія ёсьць у цэнтры і на мясцох. З гэтага мы павінны зрабіць некаторыя практычныя вывады ў адносіне ня толькі некаторых статыстычных органаў.

Другі прыклад—з зарплатай. Меншавіцкія ўплывы ў пытаньнях аб адэнцы зьмен у зарплаце рабочых СССР да гэтага часу яшчэ моцныя. Апошні час у розных органах, якія вядуць статыстыку зьмен зарплаты, панавала выразна меншавіцкая тэндэнцыя даводзіць, што быццам у бягучым годзе рэальная зарплата савецкіх рабочых зьнізілася. Ня гледзячы на тое, што гэтыя недарэчныя вывады зусім супярэчылі жыцьцю, знаходзіліся таварышы, якія былі схільны не крытычна пасылаць грубыя сказы ў гэтым-жа духу. Між тым, каб паказаць усю недарэчнасьць гэтых меншавіцкіх вываддаў, досыць канстатаваць адзін той факт, што пытаньні зарплаты не зьяўляюцца ў сучасны момант вострымі пытаньнямі ў рабочым асяродку, і што сярод рабочых, як правіла, ня чуваць галасоў аб зьніжэньні рэальнай зарплаты. І гэта ня гледзячы на тое, што ў нас разгортваецца ўсё шырэй і глыбей пралетарская самакрытыка. Зрабіўшы элемэнтарную праверку адпаведных даных, ЦК у асобнай пастанове канстатаваў хоць і ня поўнае выкананьне заданьня аб павялічэньні рэальнай зарплаты, і, у кожным выпадку, павышэньне яе ня менш, чымся на 2-3 проц. Гэта праверка і аналіз фактаў, як і заўсёды, зьяўляюцца лепшым выкрыцьцём усіх і ўсякіх меншавіцкіх паклёпаў на нашу партыю і на савецкую ўладу. Прыведзеныя прыклады ў кірунку работы некаторых статыстычных органаў павінны напомніць нам абавязковасьць для камуніста крытычнага падыходу да лічбаў і наогул да даных і да матар'ялаў, якія даюць нам буржуазныя спэцыялісты і тыя, хто цягнецца ў іх хвасьце.

Гэтыя прыклады, разам з тым, ілюструюць тую праблему ўтварэньня сваіх кадраў—кадраў пралетарскіх чырвоных спэцыялістаў, якая паўстала перад намі ва ўвесь свой рост. Недахват кадраў спэцыялістаў для вырашэньня задач сацыялістычнага будаўніцтва, якія хутка разгортваюцца, мы адчуваем на кожным кроку. Нездарма ў апошні час ідзе мабілізацыя камуністаў для розных галін практычнага будаўніцтва.

У заключэньне па пытаньні аб праблеме кадраў т. Молатаў высоўвае наступныя задачы: а) чыстка дзяржорганаў, (б) сьмелае вылучэньне новых пралетарскіх кадраў, в) узмоцненая праца над выхаваньнем маладых кадраў, а таксама ўсямернае павышэньне кваліфікацыі цяперашніх работнікаў-практыкаў і г) аб самакрытыцы і лініі партыіі.

Што датычыцца ўнутранага жыцьця партыі, дык тут у цэнтры ўвагі павінна быць пастаўлена пытаньне аб разгортваньні лёзунгаў самакрытыкі на практыцы. Гэты лёзунг стаў асноўным у справе мабілізацыі мас для барацьбы з бюракратызмам, для барацьбы з бюракратычнымі скажэньнямі і ў практыцы нашых дзяржаўных, гаспадарчых, каапэрацыйных, прафэсыянальных, а таксама і самых партыйных органаў. Сама чыстка партыі, якую мы зараз праводзім, зьяўляецца, урэшце, таксама адным з прыкладаў практычнага правядзеньня лёзунгу самакрытыкі.

Аб чыстцы партыі.

І тут стан справы ня зусім здавальняючы. Трэба зьвярнуць увагу на той факт, што процант вычышчаных у савецкіх ячэйках менш, чымся ва ўсіх іншых і ў прыватнасьці, у рабочых ячэйках. Трэба праверыць ці не недастаткова зварачваецца ўвага арганізацый да праверкі ячэек у дзяржапараце. У кожным выпадку трэба ўзмацніць барацьбу з такімі мэтадамі чысткі, якія ня ўлічваюць у належнай меры патрэбы самага шырокага прыцягненьня рабочых, у тым ліку і беспартыйных, да праверкі нашых партыйных шэрагаў.

Пасьля гэтага дакладчык пераходзіць да пытаньня аб разгортваньні лёзунгу самакрытыкі. „Спачатку гэты лёзунг,—гаворыць тав. Молатаў,—быў завостран пераважна ў адносіне гаспадарчых органаў. Сьледам за гаспадарчымі органамі пад лёзунгам самакрытыкі з асаблівай энэргіяй пачалася праверка работы прафсаюзаў». Асаблівасьцю апошняга перыяду зьяўляецца разгортваньне лёзунгу самакрытыкі на практыцы ў адносіне самых партыйных арганізацый. Як ніколі, лёзунг самакрытыкі ўжываюць зараз нашы арганізацыі. Досыць зазначыць на прыклады з Баку і Ленінградам. Агонь бальшавіцкай самакрытыкі б'е тут новым струменем у рабоце партыйных арганізацый. Але пры гэтым трэба ўлічыць і розьніцу паміж Баку і Ленінградам. У Баку мы маем прыклад няправільных адносін партыйнага кіраўніцтва да лёзунгу самакрытыкі. Ранейшыя кіраўнікі Азэрбайджанскай арганізацыі на словах таксама прызнавалі патрэбу разгортваньня самакрытыкі, але на справе мала ішлі гэтаму насустрач. Менавіта ў гэтым знайшло свой адбітак адставаньне кіраўніцтва Азтрэсту ў актыўнасьці рабочых мас і самой партыйнай арганізацыі. У выніку неразуменьня значэньня лёзунгу самакрытыкі ў даных умовах старое бакінскае кіраўніцтва абанкроцілася. Пры самым актыўным падтрыманьні партыйных мас ЦК павінен быў абнавіць гэтае партыйнае кіраўніцтва. Зараз. пры актыўным падтрыманьні рабочых, партыйная арганізацыя ў Азэрбэйджане ўсё больш аб'ядноецца на падставе правядзеньня асноўных задач партыі.

У Ленінградзе мы маем іншае становішча. Галоўнай адзнакай Ленінграду ад Баку зьяўляецца тое, што адказ на рашучы абстрэл недахопаў работы, распачаты цэнтральным органам нашай партыі „Правдой", партыйнае кіраўніцтва ў Ленінградзе ня толькі адкрыта прыслала выкрытыя ў арганізацыі недахопы, але і рашуча стала на чале практычнага правядзеньня самакрытыкі ў Ленінградзе. Ленінградзкі абласны камітэт прызнаў, што „за апошні час у арганізацыі назіралася некаторае паслабленьне самакрытыкі". І разам з тым, абласны камітэт зьвярнуўся да арганізацый з заклікам „мацней выкрываць свае недахопы, рашучым чынам ліквідаваць бюракратызм ва ўсіх нашых органах і ўстановах, шырэй і хутчэй прасоўваць кадры пралетарыяту на кіруючую работу". Ажыцьцяўленьне гэтага лёзунгу забясьпечыць палепшаньне работы савецкіх, прафэсыйных і партыйных органаў і яшчэ больш шырокае і масавае падтрыманьне гэтай работы з боку рабочых. Мы можам канстатаваць, што ленінградзкія бальшавікі, на чале з іх кіруючым цэнтрам, правільна падышлі да выкананьня сваіх новых задач. Трэба, каб за добрым пачаткам сьледам ішло далейшае разгортваньне самакрытыкі на практыцы, якое забясьпечыла-б яшчэ больш шырокі ўдзел рабочых у справе ўзмацненьня мясцовых органаў дзяржапарату, узьняцьця вытворчасьці і павышэньня працоўнай дысцыпліны на фабрыках і заводах і, разам з тым, узмацненьне самой партыйнай арганізацыі. Усё гэта зьяўляецца патрэбнай прадпасылкай сапраўды пасьлядоўнай, сапраўды пралетарскай, сапраўды бальшавіцкай барацьбы з апартуністычнымі скажэньнямі лініі партыі на практыцы. Наколькі шырока і часта сустракаюцца гэтыя апартуністычныя скажэньні лініі партыі ў практыцы работы нашых органаў, лёгка паказаць на шэрагу прыкладаў. Тут я спынюся на двух такога сэнсу прыкладах. Тав. Молатаў падае прыклад выразна апартуністычнага скажэньня лініі партыі пры правядзеньні с.-г. падатку, якое выявілася ў недавучоце аб'ектаў абкладаньня і недаабкладаньняў кулацкай вярхушкі вёскі, а затым пераходзіць да другога прыкладу.

111,9 ПРОЦАНТАЎ

Кантрольныя лічбы па рэалізацыі пазыкі БССР выканала

Побач з вялікім посьпехам у горадзе, слаба разгорнута падпіска ў вёсцы

Падпіска на пазыку не павінна паслабляцца.

Мабілізуем міліёны для выкананьня пяцігодкі.

Трэба разгарнуць кампанію па рэалізацыі пазыкі ў вёсцы.

СЯРОД СЯЛЯНСТВА РЭАЛІЗАВАНА ТОЛЬКІ НА 623000 РУБ. — 41,5 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ. — КААПЭРАЦЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ НЯ ЦІКАВЯЦЦА ПРАСОЎВАНЬНЕМ ПАЗЫКІ Ў ВЁСКУ. — БЕЛСЕЛЬБАНК, БЕЛСЕЛЬСАЮЗ, БЕЛКААПСАЮЗ І БЕЛСАМПРАМСАЮЗ ЖЫВУЮ ПРАЦУ ПАДМЕНЬВАЮЦЬ ПАПЕРКАМІ.

Пазаўчора пад старшынствам тав. Хацкевіча адбылося насяджэньне цэнтральнай камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчаднай справе.

Камісія абгаварыла даклад Наркамфіна т. Мікуліча аб ходзе рэалізацыі 3 пазыкі па БССР і справаздачы Белсельбанку, Белсельсаюзу, Белкаапсаюзу і Белкустпрамсаюзу аб удзеле гэтых арганізацый у справе рэалізацыі пазыкі.

На 10 верасьня па БССР падпіска на пазыку дасягнула 12585000 руб., што складае 111,9 проц. кантрольнай лічбы. Як быццам агульныя вынікі падпіскі добрыя, але калі паглядзім, як яна прайшла па асобных сацыяльных групах, дык мы ўбачым, што справа тут стаіць ня зусім добра.

Так, сярод рабочых і служачых кантрольная лічба выканана на 128,8 пр., а па асобных акругах гэты процант даходзіць нават да 150 (Полаччына). Такі надзвычайны посьпех у рэалізацыі пазыкі сярод рабочых і служачых, быў адказам апошніх на палітыку кітайскіх імпэрыялістаў, посьпех гэты ўвязваецца з жаданьнем працоўных ажыцьцявіць 5-гадовы плян разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры.

Другі малюнак мы маем у галіне рэалізацыі пазыкі сярод неарганізаванага насельніцтва, куды ўваходзяць саматужнікі, асобы вольных прафэсый і інш. Па гэтай групе заданьне выканана ўсяго толькі на 49,1 проц.

І асабліва дрэнна стаіць справа з рэалізацыяй пазыкі ў вёсцы, з кантрольнай лічбы ў 1500000 р. рэалізавана толькі на 623.000 руб., або 41,5 проц. заданьня.

Дырэктыў аб разгортваньні кампаніі ў вёсцы, як па партыйнай, так і па савецкай лініі дадзена дастаткова, але гэтыя дырэктывы „застралі" ў райвыканкомах і нават у некаторых акруговых цэнтрах.

Сярод большай часткі райённых працаўнікоў і значнай часткі акруговых існавала думка, што ў вёску з пазыкай ісьці яшчэ рана, а таму падрыхтоўчая праца ішла павольным тэмпам, таму сваечасова ня былі афармлены камісіі садзейнічаньня, ня быў уцягнут у працу і падрыхтован вясковы актыў. Ня было на мясцох такога настрою, каб адразу ўсімі сіламі распачаць кампанію па рэалізацыі пазыкі ў вёсцы. Бязумоўна, такі падыход „з прахладцам" адбіўся і на ходзе кампаніі ў вёсцы.

У нас на мясцох вельмі слаба, а часам і зусім не праводзіцца праца па папулярызацыі сярод насельніцтва выпікаў тыражоў. Паступаючыя аблігацыі ў уплату с.-гас. падатку фінансавымі ўстановамі не правяраюцца і пры сартыроўцы іх у крэдытных установах знойдзены 2 аблігацыі, на якія прыпалі выйгрышы па 1000 руб., а трымацеля гэтых аблігацый зараз ня знойдзеш, бо невядома каму яны належалі. Такім чынам мы бачым, што такі моцны агітуючы фактар, як выйгрыш, не вядомы асноўнай масе сялянства.

Нашы каапэрацыйныя арганізацыі амаль нічога ня робяць для таго, каб прасунуць пазыку ў вёску. Праўда, такія цэнтры, як Белсельбанк, Белсельсаюз, Белкаапсаюз, Белсампрамсаюз па сваёй нізоўцы паперак з дырэктывамі дасылалі досыць, але ніхто з іх ня цікавіцца, як гэтыя дырэктывы ажыцьцяўляюцца на мясцох, ніхто не паглядзіць на тое, што робіць іх нізавая сетка, як яна працуе ў галіне распаўсюджваньня пазыкі сярод насельніцтва, сярод сваіх пайшчыкаў.

Досыць прывесьці пару лічбаў, каб канчаткова ўпэўніцца, што сыстэма сельска-гаспадарчай каапэрацыі зусім мала цікавіцца справай распаўсюджваньня аблігацый пазыкі. Так, Гомельскае акруговае с.-гасп. крэдытнае таварыства кампаніі яшчэ амаль не пачынала—да 1 верасьня па сыстэме рэалізавана аблігацый толькі на 1580 руб., а па 41 т-ву Віцебшчыны ўсяго на... 200 руб. Недалёка ўехала сыстэма Белсельсаюзу і Белкаапсаюзу, —вынікі рэалізацыя праз нізоўку, якая мае шчыльную сувязь з сялянствам, вельмі слабая. Фармальна падышоў да справы рэалізацыі пазыкі сярод саматужнікаў і Белсампрамсаюз, —абмяжаваліся агульнымі сходамі па арцелях і правядзеньнем у апошніх падпіскі, а масавай працы па папулярызацыі дзяржаўных пазык сярод саматужнікаў, працы па распаўсюджваньню 3-й пазыкі індустрыялізацыі сярод саматужнікаў амаль ня відаць. У Гомельшчыне і Мазыршчыне саматужнікі, арганізаваныя ў арцелі, падпісваліся на 25-30 проц. месячнага заработку. Апошняе лепш за ўсё сьведчыць аб тым, як разгорнута масавая праца сярод саматужнікаў.

Цэнтральная Камісія па дакладах вынесла шэраг практычных пастаноў, якія мы асьветлім у бліжэйшым нумары.

Падпіска ў вёсцы ідзе слаба.

Кантрольная лічба па нашаму раёну для рэалізацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі вызначана ў 20 тыс. рублёў. Гэтая лічба фактычна рэалізавана, але як недахват трэба адзначыць гэта тое, што сярод сялянства распаўсюджана толькі каля 15 проц. усёй сумы. Чаму такі невялічкі процант пазыкі распаўсюджаны сярод сялян? Сказаць, што сялянства ня хоча купіць, альбо ня мае грошай, гэта было-б хлусьнёй. У чым-жа справа?

Сельскія саветы і другія арганізацыі зьяўляюцца контрагентамі, але яны яшчэ сур'ёзна за гэтую працу ня браліся. Спадзяюцца ўсе на тое, што селянін, альбо сялянка прыедуць і самі падпішуцца. Вылучаныя камісіі ад сельскіх саветаў і контрагенты лічацца толькі на паперы. Тыя абавязкі, якія ўскладзены на кожнага члена камісіі не правяраюцца, вось чаму пастановы с.-саветаў ня могуць зьяўляцца аўтарытэтнымі, бо адказнасьць сама па сабе адпадае.

Правядзеньне сходаў аб растлумачэньні карысьці пазыкі па вёсках дало некаторыя вынікі, але далей сельскія саветы спадзяюцца ўсё на прыезд райактыву і самі нічога ня робяць. Зусім дрэнная справа з крэдытнымі таварыствамі. Замест таго, каб, будучы контрагентамі, павесьці шырока растлумачэньне сярод колаў насельніцтва, Бацэвіцкае крэдытнае таварыства нават сваю падпіску здала на пошту і яшчэ не зрабіла адлічэньняў па падпісцы.

Такія нядбайныя адносіны самі па сабе патрабуюць зрабіць арганізацыйныя вывады. Вучоту аб падпісцы ўстановамі і арганізацыямі, якія прымацаваны да вышэйпамянёнага т-ва зусім няма. Бязумоўна, пры такіх умовах працы нельга сказаць ці ахоплены ўсе сто процантаў служачых падпіскаю і ці своечасова праводзяцца адлікі грошай.

Загадчык Бацэвіцкага паштовага агенства на запытаньне аб прасоўваньні пазыкі ў вёску адказаў: „Няма час; мне вазіцца з вашай пазыкай".

Гэта сьведчыць аб тым, што паштовы апарат даўно трэба было перачысьціць, бо вялікая колькасьць яго проста варожы элемэнт нашай сучаснасьці. Дзякуючы таму, што аблігацыі заўсёды можна абмяняць у касах на грошы, выходзіць, што з аднаго боку адбываецца прадажа аблігацый, а з другога боку іх мяняюць і ў выніку балянс сходзіцца, а дзяржава ад гэтага толькі нясе ўбытак. Паштовыя працаўнікі фармальна адносяцца да гэтай справы, не вядуць растлумачальнай працы аб утрыманьні на руках пазыкі. Неабходна па гэтаму пытаньню саюзным арганізацыям правесьці сталую працу. Прафэсыйныя саюзы на вёсцы такімі справамі мала займаліся.

Некалькі дзён таму назад у нас адбылася настаўніцкая канфэрэнцыя, дзе абгаварвалася, побач з другімі пытаньнямі, таксама і аб 3-й пазыцы. Некаторыя з настаўнікаў ня толькі не зьявілі жаданьня праводзіць працу ў этым напрамку на вёсцы, але-ж нават і самі адмовіліся падпісацца.

Трэба адзначыць, што частка настаўніцтва трымае сувязь з кулацкаю часткаю вёскі. На гэта саюз працасьветы павінен зьвярнуць увагу.

Пасьпяховае правядзеньне рэалізацыі 3-й пазыкі на вёсцы сярод сялян залежыць ад таго, калі ўся грамадзкасьць возьмецца больш сур'ёзна за гэтую справу.

Клічаўскі р-н. **Аноцкі.**

Выклікаю ў перагонкі.

(Ліст у рэдакцыю)

Прашу апублікаваць, што я, кантрагэнт па збору падпіскі на III пазыку індустрыялізацыі ў сяле Скрыгалаве, Мазырскай акрузі Вераксіч Антось Янкаў сярод сялян адзіночак на 10 верасьня г. г. сабраў падпіскі на пазыку на 925 руб. і сабраў грошай 188 руб. 95 к.

Я выклікаю ўсіх кантрагэнтаў Пятрыкоўскага раёну, Мазырскай акругі па збору падпіскі са мною ў перагонкі, але з умовай, у перагонкі па сялянскіх дворох.

Кантрагэнт Вераксіч А. Я.

На заводзе „Энэргія" падцягнуліся.

Ня так даўно мы паведамлялі, што падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі сярод рабочых заводу „Энэргіі" дала толькі каля 30.000 р. У зьвязку з добра праведзенай працай падпіска на 3 пазыку складала ўжо 42.500 руб. падпіска ўжо афармлена.

Павялічылі падпіску і тут.

З посьпехам прайшла падпіска і сярод працаўнікоў Менскай-паштова-тэлеграфнай канторы. Сабрана падпіскі на пазыку індустрыялізацыі на 35000 рублёў. Толькі мясцком марудзіць з афарміленьнем падпіскі.

НА БАЯВОЙ ВУЧОБЕ

Манэўры ўзмацняюць сувязь Чырвонай арміі з працоўнымі.

САЮЗ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ І БЕДНАТЫ З СЕРАДНЯКОМ—НЕПЕРАМОЖНАЯ КРЭПАСЬЦЬ, АБ ЯКУЮ РАЗАБ'ЮЦЦА ПАТУГІ ПАНОЎ І КАПІТАЛІСТАЎ.

Яна моцная і сувязьзю.

Трубач заіграў „зару"—і ўвесь лягер на нагах. Прачнуўся і горад. Вуліцы напоўніліся працоўнымі, яны вышлі са сьцягамі на провады гарнізона.

Прайшоў некаторы час, мы пакінулі горад і вышлі ў першы паходны манэўравы марш. Ветліва сустракаюць нас першыя вёскі. Працоўнае сялянства клапоціцца аб Чырвонай арміі. Сваёй прыхільнасьцю і ўважлівасьцю насельніцтва падае бадзёрасьць байцом.

Першы прывал: праводзіцца змычка байца з насельніцтвам. Прыладжваем радыёпрыёмнік. Чырвоная армія разам з баявой падрыхтоўкай праводзіць і культурны паход.

У вёсцы В.-С. чырвонаармейцы №-га кавпалка правялі агульны сход сялян. Сяляне пасьля сходу наладзілі ў суседні горад чырвоны абоз з хлебам, падпісаліся на 3-ю пазыку індустрыялізацыі. У вёсцы С. удаве бяднячцы, у якой няма каня, чырвонаармейцы перавезлі загатоўлены торф. Разам з насельніцтвам адрамантавалі шлях. У вёсцы Л. чырвонаармейцы дапамаглі сялянам беднякам абмалаціць хлеб. Чырвонаармейцы дапамагаюць беднаце зьбіраць з поля бульбу, дапамагаюць савгасу звазіць з поля снапы і інш.

Чырвоная армія моцная і магутная. Яна шчыльна зьвязана з працоўнымі, яна здольна будаваць, яна клапоціцца аб працоўных, а працоўныя аб ёй. Рабочыя і сяляне з усіх бакоў засыпаюць чырвонаармейцаў розымі падарункамі. Чырвонаармейцы № батальёну атрымалі ад рабочых падарункі, у якіх, між іншым, былі запіскі такога зьместу: „Да манэўраў 1929 году, ад рабочых і работніц Гомельшчыны, байцу РСЧА, абаронцу заваёў Кастрычніка. Сяляне вёскі Л. паднесьлі чырвонаармейцам № кавпалка рушнікі, парцянкі, масла, мыла і іншыя рэчы. Апроч таго яны вылучылі дабрахвотна некалькі фурманак для перавозкі патрэбнага.

Наш тыл моцны.

Набліжаецца ноч. Спыняемся і пытаемся ў сялян дарогі. Сяляне адказваюць з вялікай ахвотай, просяць узяць іх праваднікамі. Застанаўляемся ў вёсцы на плошчы каля клюбу, групы чырвонаармейцаў знаёмяцца з мясцовым насельніцтвам. Чутны звонкія, вясёлыя галасы. Зайграў гармонік. Чырвонаармейцы забыліся пра зморанасьць і пусьціліся ў скокі.

Паляшук.

Твар рабочага батальёну.

Панура сьпяць старыя польскія могілкі. Сьпіць і вёска. Глуха і ціха.

Раптам... у канцы вёскі штосьці заварушылася... Мільгануў аганёк, другі трэці, і доўгая цэпка аганькоў папылыла па вуліцы вёскі ўсё бліжэй і бліжэй. Нячутна па вёсцы ляцеў узвод самакатнікаў. Аганькі ліхтароў доўгаю стужкаю цягнуліся адзін за другім і хвілін праз 10 згрупаваліся каля могілак.

— Зязяй!

Лёгка саскочыўшы з вялёсыпэдаў, самакатнікі шчыльным колам акружылі камузводу тав. Пятровіча.

— Вось што работы. Раніцою сюды прыдзе батальён. Трэба загадзя нарыхтаваць кватэры. Пакуль што пойдзем да вартаўніка могілак. Там разьмяркуем рабят па райёнах вёскі.

На краі могілак белай плямай стаяла хата вартаўніка. Пастукалі. За дзьвярмі нехта заварушыўся, нешта грухнула і, урэшце, дзьверы адчыніліся. Трухлявы стары вышаў да самакатнікаў.

— Хто тут?

— Свае, чырвонаармейцы.

— Чырвонаармейцы? Ну, дык ідзеце ў хату.

Увайшлі. Маленькая канурка асьвятлялася разьбітай лямпай. У кутку побач з Езусам у добрай новай аправе вісіць патрэт Леніна, Сталіна і інш.

Самакатчыкі распалажыліся. Вызначылі рабят і накіравалі па вёсцы рыхтаваць кватэры для батальёну. Чацьвёра засталіся адпачываць у вартаўніка.

Стары пачаў клапаціцца.

— Вы ўжо мне даруйце, што ёсьць, тым і частую.

Ён выцягнуў з печы буракі, дастаў яйкі, сыр і ўсё гэта паставіў на невялічкі столічак.

— Вячэрайце.

— Ды мы, дзядуля, не галодныя.

— Не-е, вячэрайце... Змарыліся ў дарозе,—настайваў стары.

Доўга ня трэба было прасіць. Селі за стол, пачалася гутарка. Самакатнікі расказвалі дзеду аб значэньні манэўраў, а дзед гаварыў аб сябе і пра парадкі на вёсцы. Прозьвішча яго Рымашэўскі, яму 75 гадоў.

— 20 гадоў пакутваў,—кажа дзед, —жонка памёрла, а сына на тэй, на царскай вайне забілі. Адзін застаўся. Ну, думаю, капут мне. Грошай ніхто ня плаціць. Жыць ня было як. Калі прышла савецкая ўлада, парадкі неяк зьмяніліся. На сход выклікалі сельсавет абіраць. Ніколі таго ня было, каб я начальства абіраў. Лякаўся ісьці, але пашоў. Ну, і дзіва наглядзеўся. Раней у нас станавы ледзь ня старны за цара быў, а тут нічога не разьбярэш. Свайго ў старшыні абіраюць. Начальнікам зрабілі. Ну, далі мне хату, зямлі дзесяціну. Я 20 год тут праслужыў і ніколі мяне ня спытаў ніхто, як ты жывеш Рымашэўскі, а тут і хату і зямлю далі... Цяпер я добра жыву, у мінулым годзе ў сельсавет выклікалі і паперку далі. Пэнсію цяпер даюць за сына. На царскай вайне забілі сына, цар нічога не даваў, а бальшавікі ўспомнілі, што на сьвеце жыве нейкі дзед Рымашэўскі і што яму дрэнна жывецца. Цяпер я жыву. Толькі сумна. Адзін. Шляхта наша вось за Леніна, што вісіць на сьцяне, дык і не глядзіць на мяне. Бязбожнікам лічуць.

— А ў бога, дзядуля, усё-ж верыш?!—цікавяцца самакатнікі.

— Па звычаю яшчэ, калі-ні-калі малюся, тлумачыць стары, але ўжо нешта ня тое... Як-бы вам сказаць... я таго...

І сам ня можа растлумачыць толкам, ці верыць ён у бога, ці не.

Ня сьпяць самакатнікі, ня сьпіць дзед Рымашэўскі. Да раніцы цягнецца гутарка, у палітыку ўдарыліся.

— Я думаю,—кажа стары,—што кітайцаў нехта падкусвае на нас. Самі яны не палезуць. Ці не паны нашы, што адсюль выгналі, — дагадваецца стары.

* * *

Разьвіталіся самакатнікі са старым, але абразілі яго—грошы хацелі даць за вячэру. Ледзь не заплакаў стары.

— Што-ж гэта вы. Я з дарогой душой... свае, значыцца... Чырвоная армія... а вы грошы за вячэру даіцё,—і грошы ўзяць адмовіўся.

— Мне зямлю далі, хату, пэнсію, а вы—грошы за вячэру...

Пакінулі яму кнігі, брашуры, газэты. Пачало сьвітаць. Батальён уваходзіў у вёску.

* * *

Змучаныя, але бадзёра ўваходзілі ў вёску роты. Шэры налёт пылу і сьляды бяссоннай стомнай ночы ляжаў на тварах байцоў. Аднак, песьні грымелі, жарты сыпаліся, моладасьць брала сваё. Першы ход манэўраў скончан. Задача выканана. Прыбыў абоз, закіпела праца. Тэрмінова друкавала палітчасьць другі нумар друкаванай батальённай газэты «Чырвоны ТДА-авіяхімец». Тут-жа на месцы, сьвежыя аркушы газэты зьнімаліся са сьцекла-графу і распаўсюджваліся сярод барацьбітоў.

Несьпяшаючыся, клапатліва і марудна раздавала гаспадарчая частка барацьбітам боты і шынэлі. Нецярпліва чакалі кухні, але яе няма.

— Парфен, сыграй ты нам што небудзь па-весялей, пакуль кухня прыдзе,—чапляліся да кулямётчыка Лосева.

Парфен Лосеў, малады задорысты электраманцёр, а зараз ліхі кулямётчык, прайшоўся па клавішах гармошкі. Ліха грукнулі басы.

Падыйшлі дзяўчаты-стралкі.

— Вальс давайце! Грай, Парфен, вальс!

Спынілася „барыня". Па плошчы паліліся гукі вальсу.

Нельга пазнаць плошчы, не пазнаць барацьбітоў.

Куды дзелася зморанасьць!

Кружацца пары, ліецца гармонь, батальён «адпачывае».

А на рагу плошчы на плетні вісяць паходныя ротныя газэты. Іх павесілі, быццам на выстаўку. Лепш за ўсіх газэта 3-й роты. Спрытная, зубастая, вострая. Каля гэтай газэты натоўп. Сьмех і жарты гавораць за тое, што газэта цікавая.

Тры штыкі былі згублены барацьбітамі 3-га ўзводу. Яны трапілі ў газэту. Зараз над імі сьмяюцца і гэта цяжэй, чымся калі-б іх пакаралі.

Вясёлы Скрыпка.

Ён—студэнт Пэдтэхнікуму, а зараз добраахвотнік—стралок батальёну. Гэта ён піша вершы, карыстаючыся кожнай вольнай хвілінкай. Яму досыць 10 хвілін часу і больш менш роўнага пня, і вершы самі плывуць вострыя і задорыстыя.

На прывалах газэта рэдагуецца, прыводзіцца ў належны выгляд і вывешаецца на відным месцы.

Да вечара батальён вышаў з вёскі. Па дарозе праводзіцца работа сярод сялян.

Добра працуе кіно-перасоўка.

Самая яркая ў батальёне, вельмі моцная таварыская сувязь паміж барацьбітамі. У батальёне ёсьць беларусы, яўрэі, палякі, поўны інтэрнацыянал, моцны, спаяны. Увесь батальён—добра спаянае баявое ядро, ядро палітычна моцнае, баяздольнае.

Г. Л.

Удалая разьведка.

(Райён манэўраў).

Ноч. Сборны рабочы батальён ТДА-Авіяхіму займае абаранцельную пазыцыю. У вёскі К. замацавалася 1 рота, вёска Д. занята 3 ротай, а другая рота высунулася далёка—ў перад да вёскі С.

У штабе б-на сьпешка, бегатня. Кавалерыйскія часьці праціўніка сунуліся на наш №-скі полк, выяўлены панцырныя машыны. Тэрмінова выслана разьведка, разьведка мінула балота і сунулася ўправа ад дарогі ўперад. Дзесьці далёка стукалі гарматы, часамі стук зьмешваўся са свістам пуль ад перастрэлкі—гэта часьці палка ўступілі ў бой з праціўнікам.

Разьведка прайшла 5 кілёмэтраў і застанавілася — далей ісьці нельга. Уперад высланы 3 разьведчыкі, астатнія схаваліся ў кустох і адтуль назіраюць. Замечан эскадрон кавалерыі праціўніка, паслана данясеньне ў штаб.

Пачало сьвітаць. Холадна. Трошкі лявей і ўперад разьведкі падазронна рухаюцца кусты. Разьведчыкі пільна прыглядваюцца. Замечаны верхавыя. Падрыхтавацца—ціха камандуе начальнік разьведкі.

З крыкам ура, махаўшы шашкамі, кавалерысты кінуліся ў атаку на роты суседняга №-га палка.

Разьведка агонь—заграмоў залп, за ім другі, застукалі кулямёты.

Задрыжэў эскадрон, спалохаліся коньня, для іх агонь з гэтага боку нечаканы. Схапіліся, але позна—агонь разьведчыкаў выводзіў іх са строю. Раптам на іх кінулася і наша коньніца. Нашы байцы бадзёра кідаюцца ў бой. Нечакана сыгнал—бой скончан, коньніца «праціўніка зьнішчана».

Верхавыя ў непаразуменьні, злыя—адкуль тут узялася разьведка, але позна шукаць.

Тэрмінова паслана данясеньне ў штаб б-на— разьведка удалая, разьведка садзейнічала перамозе над праціўнікам.

Л.

ГНЕЗДЫ РЭЛІГІЙНАЙ ПОШАСЬЦІ ПЕРАБУДУЕМ У ДВАРЦЫ КУЛЬТУРЫ.

ПАД МАСКАЙ СЛУЖКІ БОСКАГА КРЫЕЦЦА АГЭНТ БУРЖУАЗЕІ І ПАНА.

Няшчадная вайна супроць папоў-эксплёататараў, сэктантаў і ўсіх іншых прапаведнікаў рэлігійнага дурману!

БЫЎ КАСЬЦЁЛ, А ЗАРАЗ ТЭАТР НА 500 АСОБ.

(г. Дуброўна, Аршанскай акругі).

Доўга стаяў стары аграмадны касьцёл без карысьці. Нават рэлігійных абрадаў у ім не адбывалася.

Касьцёл мураваны. Мур аблупіўся, сям-там патрэскаўся.

„грэх" было-б заглянуць да нас. Тэатр маем добры, на пяцьсот асоб.

У зімовыя доўгія вечары працоўныя гораду Дуброўна будуць культурна адпачываць у цёплым вялікім будынку.



А ў гэты час грамадзкія арганізацыі, арганізаваныя дзеці—вучні і піанэры гораду Дуброўна ня мелі прытулку. У часе кампаніі па перавыбарах саветаў шэрагам пастаноў грамадзян гораду была дасягнута перадача гэтага будынку пад кіно-тэатр. Цяпер і вандроўнаму тэатру Галубка ня застаецца толькі мясцовым культурным сілам узмацніць сваю культпрацу.

Разам з касьцёлам перададзены працоўным гораду дзьве яўрэйскіх сынагогі—і намечаны да перадачы дзьве царквы. Адна сынагога адведзена на школьныя патрэбы, а ў другой зьмесьціцца рабочая амбуляторыя.

Б.

Духоўнікі актывізуюцца.

(Ладнянскі райён, Аршаншчына).

Папоўства і сэктанты ў Ляднянскім райёне ў апошнія часы вельмі заварушыліся. Поп Кісялёўскай царквы Іскоскага сельсавету сёлетняй вясной нават вёў агітацыю сярод сялянства, каб апошняе зрывала сходы аб калектывізацыі.

Больш сур'ёзны характар мае сэктанцтва ў Бельскім сельсавеце і папоўства ў Баеўскім сельсавеце. Яны наладзілі свайго роду рэлігійны блёк. Арганізуюцца царкоўныя хоры, моладзь уцягваецца ў царкву.

Райённы савет бязбожнікаў зьвярнуўся да камсамольцаў, партыйцаў і настаўніцтва з заклікам да больш шырокай антырэлігійнай працы.

Я. Кручкоў.

Сацыялістычнае спаборніцтва на антырэлігійным фронце.

Барацьба з рэлігіяй, як і ўсякая іншая праца, можа быць шырока разгорнута, толькі ў выпадку ўцягненьня ў яе самых шырокіх мас працоўных. Саюз ваяўнічых бязбожнікаў да гэтага накіроўваецца, ён згуртоўвае навакол сябе масы. Але трэба яму дапамагчы. Трэба, каб кожная савецкая ўстанова, кожная савецкая арганізацыя са свайго боку паставіла задачай раскачаць масы на барацьбу з рэлігіяй, узьняць сярод іх рух за адмову ад рэлігійных сьвят, зачыненьне цэркваў, зьнішчэньне старога рэлігійнага быту, як мага шырэй арганізаваць гэты рух.

У якасьці рычага такога ўздыму і ўцягненьня самых шырокіх мас у справу бязбожніцтва трэба скарыстаць сацыялістычнае спаборніцтва.

Бязбожнікі дзе-ні-дзе разгарнулі ўжо спаборніцтва паміж асобнымі ячэйкамі, саветамі, арганізацыямі. Ёсьць ужо і вынікі гэтага спаборніцтва: рост сяброў бязбожніцкіх арганізацый, палепшаньне антырэлігійнай вучобы, прыкметная практычная дапамога з боку СВБ справе сацыялістычнага будаўніцтва і г. д.

Але гэтыя дасягненьні яшчэ вельмі нязначныя і ахапілі далёка ня ўсе арганізацыі СВБ.

Перад савецкай грамадзкасьцю стаіць задача ўцягнуць масы ў гэта спаборніцтва бязбожнікаў, падтрымаць яго сваім удзелам. Недарма партыя, даючы дырэктыву Саюзу Бязбожнікаў аб сацыялістычным спаборніцтве, у той-жа час зазначыла па неабходнасьць „уцягненьня ў гэту справу ўсей савецкай грамадзкасьці".

Школы, клюбы, хаты-чытальні павінны ўступіць у спаборніцтва на лепшую пастаноўку антырэлігійнай працы; вёскі—на зьмяншэньне выдаткаў на рэлігію, на аддачу дамоў малітвы ў культурна-асьветныя ўстановы, на зьнішчэньне п'янства, самагоншчыны, асабліва ў дні рэлігійных сьвят; калгасы і савгасы—на лепшую, паказальную антырэлігійную працу сярод ваколічнага насельніцтва; каапэрацыйныя ўстановы і дзяржгандлю—на ліквідацыю абслугоўваньня таварамі, якія патрэбны для рэлігійных сьвят; друкары, будаўнікі павінны цалкам адмовіцца ад друкаваньня рэлігійнай літаратуры, ад пабудовы новых малітвенных будынкаў, рамонту старых; працаўнікі мастацтва і літаратуры—на стварэньне масавых мастацкіх твораў для барацьбы з рэлігіяй.

Трэба, каб увага ўсёй савецкай грамадзкасьці была завострана на гэтых пытаньнях.

Ф. А.

РАЙСКАЕ ЖЫЦЬЦЁ ПАНА ШЧЭРБЫ

У вёсцы **Бяседавічах** (Хоцімскі райён, Магілеўшчына) ёсьць поп Шчэрба, які і па гэты час лямантуе з амвону, плача і б'е сябе ў грудзі кулаком, каб больш выманіць з сялян фруктаў і яек. У апошні час ён так забагацеў і скалаціў такую купу грошай, што пабудаваў сабе чатыры ўрад хаты, дзьве пуні, сьвірны і іншыя будынкі.

Усё гэта ён так абсталяваў, што кожны, хто праяжджае каля вёскі кажа: «Відаць, пад сямігодку пабудавалі такія палацы".

Вельмі балюча чуць такія сарказмы і глядзець на школу, якая мае вельмі мізэрны выгляд, асабліва ў параўнаньні з будынкамі папа, хоць яна і абслугоўвае каля трохсот з лішнімі двароў, а папоўскія палацы—усяго адну душу папа.

Не падумайце, што поп мае толькі будынкі, вядомая рэч што будынкі хлеба не дадуць і ў вазонах жыта, з бульбай не пасодзіш. Куды там! Поп і да рэвалюцыі ня меў столькі зямлі, колькі ён мае зараз! Ды яшчэ якой зямлі!

Пасьля земляўпарадкаваньня ў 1927 28 г. яму далі 7 гэктараў зямлі, і пры гэтым яшчэ зрабілі так, каб яго сядзіба з чатырма хатамі была каля самай царквы. А за 4-5 вёрст, на пуста шы, пасадзілі беднякоў.

Улетку 1928 г., калі камісія разьмяркоўвала зямлю, ў гэтай камісіі быў сакратар партыйнай ячэйкі Пятрусь Харкевіч. Але-ж ён ні слова не сказаў супроць такога разьмеркаваньня.

Ды і як гэта ён Харкевіч, сам духоўнага паходжаньня, ды будзе свайму чалавеку рабіць такую няпрыемнасьць!

Так і застаўся сабе поп каля самай сваёй „кузьні", атрымаўшы сенажаць і зямельку першай якасьці. А беднякі-сяляне гібеюць на пустэчы бяз хлеба і ідуць да папа наймацца, абы толькі не загінулі з голаду.

Сялянская беднота пасе сваю жывёлу на голым выгане, а кабыла папа гадуецца каля царквы, дзе трава вышэй калена, кругом абгароджана і даступна толькі паповай кабыле.

Такім чынам, поп эксплёатуе сотні сялян ня толькі праз сваю «кузьню» але і праз гаспадарку.

Аб гэтым ужо гутарылі на нашых сялянскіх сходах цэлы год, П. Харкевіча за пакрыўленьне клясавай лініі выключылі з партыі, але папа ніхто не чапае.

І жыве сабе ён сапраўдным эксплёататарам і думае, што пасьля „перастаўленьня сьвету" (ён так заве рэвалюцыю) трапіў у рай.

Калі-ж скончыцца папоўскае панаваньне?

Селянін.

У лягер, на змычку.

Сёньня горад вабіць нас сваім бадзёра-дзіўным настроем. Вуліцы напоўнены працоўнымі. Вас цягне туды дзе кепка заводу вітае шлем лягеру, у якім ідзе падрыхтоўка да генэральнай праверкі манэўраў. Разнакалёрны горад апранаецца ў шэрую шынэль. Трубы заводу падпяразваюцца чырвонаю істужкаю. Чырвонаармеец у цэнтры ўвагі ўсёй грамадзкасьці. Высокія муры прыветліва ўлыбаюцца рабочым калёнамі маршыруюць.

На крутому берагу мы прабіраемся да палатнянага гораду—сьпяшым у лягеры № дывізіі. Сёньня культзмычка рабочай моладзі з чырвонаармейцамі. Асьветлены праменьнямі сонца пляц лягеру выглядае горда і прыгожа прытуліўшыся да кучаравых бяроз, ганарова стаяць задраў лычы марціры, танкі, прыціўшыя пад свой дах кубла «Максімак». Лягер вялікі складаны і арганізаваны арганізм. Тут усе на сваім месцы. У парадку і чыстаце. Гэта сапраўдная жывая машына. Варта толькі галоўнаму рычагу даць сыгнал, як увесь гэты складаны арганізм пачне рухацца. Мы ў палкавым клюбе. Бойкая газэта Ільлічоўка прыкоўвае нашу ўвагу сваім зьместам. Гэта сапраўднае люстра чырвонаармейскага жыцьця.

— Ільлічоўка ў нас гэта адзін з лепшых рычагоў культуры чырвонаармейца—зазначае член рэдкалегіі чырвонаармеец Сумар. Хутка прымясьціліся і пачалася сумесная праца, праца якая злучае 2 частак аднаго вялікага арганізму—будаўніка новага жыцьця.

Якуб.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену ўвагі да арт, 28 палажэньня аб дзяржаўным натарыяце БССР.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР паотанаўляюць замяніць увагу да арт. 28 „Палажэньня аб дзяржаўным натарыяце БССР" (З. З. БССР 1928 г. № 38, арт. 374) абзацамі 3 і 4 у наступнай рэдакцыі:

„Пасьвядчаючы акты прыватных асоб аб адчужэньні маемасьці (будынкаў, права забудоўкі, гандлёвых прадпрыёмстваў і г. д.), натарыяльная кантора павінна патрабаваць паданьня даведак фінансавых органаў аб выплаце адчужальнікам усіх налічаных на яго падаткаў незалежна ад надыходу тэрмінаў іх выплаты.

Калі адчужальнік не заплаціў усіх налічаных на яго падаткаў, то акт пасьвядчаецца толькі тады, калі набывальнік бярэ на сябе адказнасьць за своечаснае і поўнае паступленьне падаткаў налічаных на адчужальніка да моманту адчужэньня ім маемасьці".

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

17 верасьня 1929 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

об изменении примечания к ст. 28 положения о государственном нотариате БССР.

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют заменить примечание к ст. 28 „Положения о государственном нотариате БССР" (С. З. БССР 1928 г. № 38, ст. 374) абзацами 3 и 4 в следующей редакции:

„При удостоверении сделок частных лиц об отчуждении имущества (строений, права застройки, торговых предприятий и т. п.) нотариальная контора должна требовать представления справок финансовых органов об уплате отчуждателем всех начисленных на него налогов независимо от наступления срока их уплаты.

В том случае, если отчуждатель не уплотил всех начисленных на него налогов, удостоверение сделки может быть произведено лишь при условии принятия приобретателем на себя ответственности за своевременное и полное поступление налогов, начисленных на отчуждателя до момента отчуждения им имущества".

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

17 сентября 1929 г.
г. Минск.

Лёд закасьцянеласьці крануўся.

ПРАФАРГАНІЗАЦЫІ ПАЧЫНАЮЦЬ ПЕРАБУДОЎВАЦЬ СЫСТЭМУ ПРАЦЫ.

Абсьледваньне прадстаўнікоў Усе ЦСПС працы прафсаюзаў Беларусі, якое выявіла шэраг хворых зьявішч, асабліва ў формах і мэтадах працы, зьявілася бясспрэчным штуршком да пераводу ўсёй працы прафсаюзаў на новыя рэйкі, новую сыстэму, якая ўносіць ажыўленьне ў працу адпаведна задачам дню.

Ужо вядзецца канкрэтная праца ў справе ажыцьцяўленьня пастаноў УсеЦСПС.

Папершае, ідзе шырокая папулярызацыя ў прафсаюзных масах памянёных пастаноў. Абгаварэньне іх праходзіць па нізавых арганізацыях, цэхах і зьменах, куды выяжджаюць прадстаўнікі ЦП саюзу.

Часопісь „Прафрух Беларусі" пачала папулярызацыю пастаноў прэзыдыуму УсеЦСПС па асобных галінах прафпрацы.

Арганізацыйны аддзел ЦСПСБ прыступае да праверкі выкананьня ніжэйшымі прафарганамі пастаноў ЦСПСБ за апошняе паўгодзьдзе.

Арганізацыйны аддзел вызначае шэраг мерапрыёмстваў па ажыўленьні форм працы прафорганаў (каб зрабіць цікавымі агульныя сходы, ажывіць працу ў цэху, каб правярялася выкананьне пастаноў сходаў рабочых і г. д.).

Культаддзел ЦСПСБ пачынае агляд стану масавай працы ў 10 буйных прадпрыёмствах і 2 савгасах.

Распрацован плян ліквідацыі няпісьменнасьці сярод 14 тысяч членаў прафсаюзаў і малапісьменнасьці сярод 6 тыс. чл. прафсаюзаў.

Для ўзмацненьня інтэрнацыянальнай працы сярод членаў прафсаюзаў культаддзел увёў у праграмы курсаў і школ, якія будуць сёлета працаваць, разьдзел аб нацыянальнай палітыцы.

У хуткім часе намечана склікаць Усебеларускую нараду па пытаньнях ліквідацыі няпісьменнасьці і нізавой масавай працы.

Культаддзел зварачвае галоўную ўвагу на непасрэднае інструктаваньне нізавых прафячэек па асобных канкрэтных галінах працы.

ЦП саюзу с. г. і лясных рабочых вызначыў шэраг мерапрыёмстваў па ўзьняцьці масавай клясава-выхаваўчай працы.

ЦП саюзу намячае ў бліжэйшы час адчыніць сталую гадовую школу для падрыхтоўкі прафпрацаўнікоў.

ЦП саюзу гарбароў разгарнула працу па адчыненьню прафшкол для прафактыву, дзе будуць прапрацаваны ўсе галоўныя пастановы зьезду і канфэрэнцый прафсаюзаў. Вырашаецца пытаньне аб адчыненьні Ўсебеларускай прафшколы для нізавога прафактыву.

ЦП саюзу намецілa вылучыць з ліку рабочых-актывістаў інструктароў для праверкі і інструктаваньня працы нізавых прафорганаў, арганізуючы дзеля гэтага пры ЦП дабраахвотную інструктарскую брыгаду.

Белбюро чыгуначнікаў прыступае да генэральнай праверкі ўсёй нацработы саюзаў у БССР. Абсьледваньне мае на мэце праверку ажыцьцяўленьня пастаноў партыйных і прафэсійных арганізацый па нац. пытаньні.

У сувязі з антысэміцкімі вылазкамі на шкляных заводах, ЦП саюзу хімікаў праводзіць вялікую працу па ўзмацненьню інтэрнацыянальнага выхаваньня членаў саюзу. Наладжваецца шэраг дакладаў, гутарак, лекцый, праведзена выбарачнае абсьледваньне стану інтэрнацыянальнай працы на некаторых заводах, намечана абсьледваньне працы ў цэхах, дзеля чаго выяжджаюць члены прэзыдыуму на месца.

Для ажыўленьня працы ў вёсцы ЦП саюзу намецілa арганізаваць чырвоныя куткі і ліпункты ў тых вёсках, дзе жывуць рабочыя хімікі.

Наогул, прыкметна ажыўленьне працы прафсаюзаў, накіраванае на большую масавасьць і арганізаванасьць.

Пры агульнай падтрымцы членаў прафсаюзаў, у першую чаргу прафактыву, праца саюзаў хутчэй будзе праведзена на новую сыстэму.

Рудон.

РАБСЕЛЬКОРЫ НАМ ПІШУЦЬ.

„А КАБ ВАМ ГОРЛЫ ПАЗАТЫКАЛА!".

Так крычыць на сходах земляўпарадкавацель т. Базыленка, які працуе зараз у Кармянскім раёне, Магілеўскае акругі, калі хто з сялян адважыцца загаварыць мацней у спрэчках, альбо ў часе яго дакладу. Ён таксама любіць і „катацца" за рахунак сялян, бяручы для свайго асабістага карыстаньня коні з „нараду". Езьдзіць за 30—20 кілёмэтраў і прывозіць адтуль сабе „прыслугу". Усё каволічнае сялянства ён трымае ў страху—пужае „Салаўкамі". Ён, Базыленка, вялікі бюракрат, але яго з партыі ня вычысьцілі, ня вычысьцілі і быўшага старшыню Кароцькаўскага сельсавету Зэлічонка, які растраціў каля 40 рублёў і запусьціў видоімку на 1170 рублёў—таму што партыйцы, комсамольцы і беспартыйныя сяляне баяліся супроць яго выступіць, каб не папасьці ў „Салаўкі".

З.

МАНУФАКТУРА—ДЛЯ „НЭПАЎЦАЎ".

У Крушынаўскае аддзяленьне Азаранскага спажывецкага таварыства прывезьлі мануфактуру, значная частка (на 30 р.) якое папала нэпману Шчэрбічу з Рагачэўскага раёну.

М ТУРАЎ ТОПІЦЦА Ў ГРАЗІ.

Мястэчка Тураў, Мазырскае акругі, а таксама і ўвесь раён дзякуючы нядбайнасьці мясцовае ўлады топіцца ў грязі. Нават і прыказка склалася—„Ну і прыстаў, як тая тураўская грязь", але нашы бюракраты, што сочаць за шляхамі, і „ў вус сабе ня дуюць"—сьпяць.

Н.

КАНДЫДАТЫ ДА ЧЫСТКІ.

У Горках Аршанскае акругі, загадчык савгасу „Леніна" Баброў—сын быўшага памешчыка гаспадарыць так добра, што хутка ўсё „прагаспадарыць". Ён мае цесную сувязь з „нэпманамі", бярэ ад іх грошы і „выплачвае" працэнты натураю—савхозаўскімі прадуктамі.

Бухгальтар Піпчэнка гэтага-ж савгасу сыстэматычна п'янствуе, хуліган, распусьнік, быў пад судом—вось хто Піпчэнка. Такіх дабрадзеяў у савецкім апараце нам ня трэба.

Леніноц.

ХЛЕБ—НА ПАБУДОВУ ТАНКА.

Гэтымі днямі ў Рагачэве калгасы і сельска-гаспадарчыя арцелі здалі калектыўна 1000 пудоў жыта. За гэтым прыкладам пашлі і бядняцка-серадняцкія гаспадаркі. Грошы за здадзены хлеб пойдуць на пабудову танка імя газэты „Камуніст".

Я. Крушына.

ЧАМУ НЯ ХОЧУЦЬ ЗЕМЛЯЎПАРАДКАВАЦЬ КАЛГАС?

Згодно распараджэньня Мазырскага Акрэа павінны быць земляўпарадкаваны пасялкоўцы пасёлку „Сталёвы" ў першую чаргу, а калгас „Адраджэньне"—у другую. Земляўпарадкаваньне праходзіць на пасёлках, а пра калгас усе забыліся. Чаму гэта так—ня ведаем.

А. Яўхім.

ЗА БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЬ І РАСТРАТУ—ПАВЫШЭНЬНЕ.

Быўшы загадчык Горскага вадзянога млыну тав. Пуцулан у часе працы ў гэтым млыне трымаў сувязь з кулакамі і прадаваў „нэпманам" для спэкуляцыі жыта. Аб гэтым ужо пісала „Савецкая Беларусь". Аднак, замест таго, каб звольніць з савецкай службы, тав. Пуцулана пераводзяць загадчынам лесапільнага заводу ў Богушэўскім раёне, Аршанскае акругі. Ці ня будзе ён там прадаваць дошак, га, таварышы, як вы думаеце?

Шыла.

ЗАЯДЛЫ АНТЫСЭМІТ І П'ЯНІЦА.

Загадчык Борцкага адзьзяленьня Мсьціцкага спажывецкага таварыства Зямчонак улез у каапэрацыю дзеля таго, каб не плаціць падатку за сваю моцную серадняцкую гаспадарку. У каапэрацыі ён любіць выпіваць, а калі нап'ецца, дык пачынае хуліганіць і лаяць яўрэяў [называючы іх „нехрысьцямі-жыдамі". А калі супрацоўнікі каапэрацыі зрабілі яму заўвагу, дык ён пачаў лаяць іх гаворачы: „Ці ня была, часам, „жыдоўкаю ваша маці". Вон, зараз-жа, з шэрагаў савецкіх працаўнікоў гэткае гніллё.

Пайшчык.

БОБРСКІ КСУ БЯЗЬДЗЕЙНІЧАЕ.

Старшыня Боброкага КСУ Крупскага раёну гр-н Бязмозгі ніякай працы сярод беднаты і ў камітэце не вядзе. Сяброўскія ўзносы ня ўносяцца. Пленумы і паседжаньні прэзыдыуму не адбываюцца. Вясною пры раздачы беднаце насеньня старшыня беднаце даваў фунтамі, а сабе ўзяў 9 пудоў. Ды, наогул гр-н Бязмозгі лічыцца моцным серадняком, якому ў КСУ ня месца.

Актывіст.

«НУ, ТАВАРЫШ ЦЯРЭНЦЬЯЎ, БУДЗЬМА ЗДАРОВЫ»!... НА ЗДАРОЎЯЧКА...

У Менскім АКРЗА працуе на агнятрывалым будаўніцтве тэхнік Цярэнцьяў. Ён зсябраваўся з кустаром, багатым рамізьнікам Васілеўскім Францам, куды ходзіць у „госьці" вось ужо скора год. А ходзіць „таварыш" Цярэнцьяў таму, што ён устроіў на працу сына Васілеўскага Вячыслава, які ня мае належнае кваліфікацыі па агнятрываламу будаўніцтву, ды які меў патэнт на рамізнасьці.

— Ну, таварыш Цярэнцьяў, будзьма здаровы!...

— На здароўечка, пане Васілеўскі,—адказвае „таварыш"—і перакідае проста памастацку чарку добрае запяканачкі...

І так, рэгулярна, кожны месяц чуецца: „Будзьма здаровы, таварыш..." і „на здароўечка, пане"...

Эх, дрэнна чысьцілі таварышы з РСІ Менскае АКРЗА... Памылку трэба выправіць, яшчэ ня позна.

Аса.

«САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» ДАПАМАГЛА.

У Калінкавіцкім раёне пасьля выезду рэдакцыі „Савецкая Беларусь" распачаўся шырокі калгасны рух. Арганізавана 10 калектываў, у гэтым ліку камуна „Авангард".

Вока.

ПРАФСАЮЗЫ МАЛА ЦІКАВЯЦЦА ПЕРАВОДАМ ПРАЦЫ НА БЕСПЕРАПЫННЫ ТЫДЗЕНЬ.

ПРАФАРГАНІЗАЦЫІ НЕ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА ШТУРХАЧАМІ ДЛЯ ПРАПРАЦОЎКІ ПЫТАНЬНЯ ПЕРАВОДУ ПРАЦЫ НА БЕСПЕРАПЫННЫ ТЫДЗЕНЬ. ПРАФСАЮЗЫ—У ЯКАСЬЦІ БЯЗУДЗЕЛЬНАГА НАГЛЯДАЛЬНІКА. РАБОЧЫЯ МАСЫ НЯ ЎЦЯГНУТЫ Ў ПРАПРАЦОЎКУ ГЭТАГА ПЫТАНЬНЯ.

(Гутарка з загадчыкам АТЭ ЦСПСБ тав. Розіным).

У газэце „Правда" было адзначана, што пытаньне аб пераводзе прамысловасьці на бесперапынны рабочы тыдзень усё яшчэ падпрацоўваецца, прапрацоўваецца і ўзгадняецца ў розных камісіях, на нарадах, а поўнага зруху ў гэтай справе дагэтуль няма. Гэткае становішча ў вырашэньні такога вельмі важнага пытаньня ня лепш стаіць і ў нас, у БССР.

Гэтымі днямі пры ЦСПСБ адбылася нарада прадстаўнікоў ЦП Саюзаў, на якой выявілася, што прафарганізацыі ня толькі не зьяўляюцца штурхачамі для прапрацоўкі гэтага пытаньня ў масах, але вельмі часта зьяўляюцца толькі бязудзельнымі глядачамі, калі яно прапрацоўваецца нашымі гаспадарчымі арганізацыямі і адміністрацыямі прадпрыёмстваў. І гэта ў той час, калі пытаньне аб пераводзе працы на бесперапынны рабочы тыдзень зьвязана з вырашэньнем цэлага шэрагу важнейшых праблем: што лепш—перавод на 5-ціднёўку, або 6-ціднёўку, папаўненьне рабочай сілы і яе падрыхтоўка і г. д. Дагэтуль машыны і варштаты на нашых прадпрыёмствах да 80 дзён у годзе стаялі без работы, а перавод прамысловасьці на бесперапынны тыдзень патрабуе павялічэньня рабочай сілы прыкладна на 20-25 проц. Пытаньне аб падрыхтоўцы тэхнічных кадраў, пытаньне культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых мас, масавая праца па цэхах, прыстасаваньне працы клюбаў, ясьляў і іншых бытавых устаноў—усё гэта зьяўляецца важнымі пытаньнямі, якія трэба прапрацаваць.

Усе гэтыя пытаньні ня ставяцца для канкрэтнага абгаварэньня на масавых рабочых сходах, не абгаварваюцца ў вытворчых камісіях і на нарадах. На многіх прадпрыёмствах слаба ўяўляюць сабе, што такое бесперапынны рабочы тыдзень і што ён павінен даць для ўзмацненьня тэмпу індустрыялізацыі нашай краіны. Больш таго, рабочыя не ўяўляюць сабе, што дасьць бесперапынны тыдзень на іх прадпрыёмстве.

Мы сёньня ў умовах БССР ня ставім пытаньня аб пераводзе на бесперапынны рабочы тыдзень усіх прадпрыемстваў, але разам з тым кожны рабочы павінен мець уяўленьне аб тых эканамічных і палітычных эфэктах, якія дасьць ён на даным прадпрыёмстве.

Прэзыдыум УсеЦСПС выказаўся за перавод працы на 5-ціднёўку. Ці адпавядае гэта нашым умовам?

Гэта ў умовах БССР зьяўляецца зусім правільным і жыцьцёвым на шэрагу матываў. Папершае—5-ціднёўка, бясспрэчна, выгадна з боку аховы працы ня толькі для рабочага, але і для прадпрыемства. Рабочы працуе 4 дні, а пяты адпачывае, такім чынам, дні адпачынку будуць больш частымі. У поўнай меры выконваецца дэкрэт Савнаркому СССР аб тым, што, у зьвязку з пераходам на бесперапынны тыдзень, у рабочага не павінна зьменшыцца колькасьць дзён адпачынку. Сапраўды, пры сучаснай сыстэме рабочы мае 78-79 дзён адпачынку ў працягу году, пры 5-ціднёўцы колькасьць дзён адпачынку не павялічваецца і не зьмяшаецца (365:5=73 дні, плюс 5 дзён рэвалюцыйных сьвят, а разам 78 дзён).

Пры ўвядзеньні 5-ціднёўкі больш патрабуецца і рабочай сілы, што значна зьменшыць беспрацоўе, а таксама павялічыцца валавы выпуск прадукцыі нашай прамысловасьці.

БЛІЖЭЙШЫЯ ЗАДАЧЫ ПРАФСАЮЗАЎ.

Незалежна ад таго, пяройдзе тое або іншае прадпрыемства на бесперапынны рабочы тыдзень, перад нашымі прафарганізацыямі стаіць асноўная задача прыняць самы актыўны ўдзел у распрацоўцы гэтага пытаньня і зьяўляецца застрэльшчыкамі ў прапрацоўцы апошняга на прадпрыемствах. Трэба ўсямерна растлумачваць гэту вельмі важную справу рабочым, бо ідэя пераводу прамысловасьці на бесперапынны тыдзень можа быць ажыцьцёўлена не канцэлярскім ці габінэтным шляхам, а толькі пры самым актыўным і жывым удзеле ўсёй рабочай масы.

Да пераводу прадпрыемства на бесперапынны рабочы тыдзень кожная прафсаюзная арганізацыя павінна мець яснае ўяленьне аб прыстасаваньні масавага культурнага і бытавога абслугоўваньня рабочых, і ўвесь тэмп працы прафсаюзных арганізацый павінен быць прыстасаваны да новых умоў працы і жыцьця прадпрыемстваў.

Трэба больш узмоцненым тэмпам, чым дагэтуль, павесьці працу па пераводу гандлёвых прадпрыемстваў і культурных устаноў у першую-ж чаргу на бесперапынны тыдзень павінны перайсьці нашы прафсаюзныя органы.

Саюз савганальслужачых аднэй з бліжэйшых задач павінен паставіць пытаньне аб прапрацоўцы і кіраўніцтве працай па пераводу савецкага апарату на 5-ціднёўку, з павялічэньнем рабочага дню да 7 гадзін. Тут трэба будзе правесьці вялізарную рацыяналізатарскую працу, каб перавод у савецкім і прафсаюзным апараце ня выклікаў павялічэньня штатаў.

ХРОНІКА.

Пленум Менгарсавету.

У чацвер, 26 верасьня склікаецца пленум Менскага гарадзкога савету.

Пленум заслухае даклад „Эльводу" і абгаворыць пытаньне аб чысьцы савецкага апарату.

Перавод прадпрыемстваў на 7-мігадзінны рабочы дзень.

Урадавая камісія па падрыхтоўцы правядзеньня 7-гадз. рабоч. дню ў прамысловасьці пры СНК БССР на апошнім пасяджэньні пастанавіла перавесьці ў чацвертым квартале бягучага гаспадарчага году на сямёхгадзінны рабочы дзень фабрыку „Дняпроўская мануфактура" ў Дуброўне.

Побач з гэтым пастаноўлена перавесьці на 7-мі гадзінны рабочы дзень у першым квартале 1929-30 году панчошна-трыкатажную і махорачную фабрыкі ў Віцебску, шклозавод „Камінтэрн" у Бабруйшчыне і Менскі дражжавы завод „Пралетары".

Вынікі дню калектывізацыі на мазыршчыне.

Па Мазыршчыне дзень калектывізацыі прайшоў у напрамку разгортваньня масавай працы па сацыялістычнай перабудове вёскі, узмацненьня старых і арганізацыі новых калгасаў. У дзень калектывізацыі арганізавана 40 новых калгасаў, з іх аформлена на гэты дзень 23 калгасы колькасьцю у 416 гаспадарак, аб'яднаны 4 калгаса ў 2 больш буйных. Падана ад 84 гаспадароў заява аб уступленьні ў старыя калгасы, арганізаваны 34 прасьцейшыя вытворчыя аб'яднаньні, сабрана сродкаў у фонд калектывізацыі па няпоўным зьвесткам каля 400 пуд. збожжа. Слабая праца была праароблена з боку шэфарганізацый у сэнсе пасылкі брыгад у вёску, таксама слаба была разгорнута праца па праверцы дагавароў і разгортваньня сац. спаборніцтва.

Вярнуўся з водпуску Наркамгандлю т. Бэнэк.

Наркамгандлю БССР т. Бэнэк вярнуўся з чарговага водпуску і з учарашняга дня прыступіў да выкананьня сваіх абавязкаў.

Пабудуем самалёт.

У зьвязку з апошнімі падзеямі на ўсходняй мяжы селяне, сябры т ваў узаемадапамогі сабраліся на сход, дзе аднагалосна пастанавілі сабраць сродкі па пабудову самалёту. На гэтым сходзе прысутнічалі сяляне Веляціцкага, Чырвона-Слабодзкага, Чарневіцкага, Халапеніцкага сельсаветаў, у ліку 419 чалавек. Усяго сабрана на пабудову самалёта 91 руб. і 10 кап.

Гэтыя селяне выклікаюць зрабіць па іх прыкладу Бярэзінскі і Барысаўскі райёны.

Патрабуецца 200 бочак цэманту для скончэньня будаўніцтва.

Для скончэньня будаўніцтва у бягучым сэзоне па лініі прамысловасьці ВСНГБел. патрабуецца дадаткова 200 бочак цэманту.

ВСНГ ставіць пытаньне перад Нар. Кам. Гандлю аб завозе ў БССР паказанай колькасьці цэманту.

Ліквідацыя няпісьменнасьці сярод батракоў і с.-гаспадарчых рабочых.

У 1929-30 навучальным годзе па лініі саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых ліквідацыяй няпісьменнасьці будзе ахоплена 50000 чалавек, на што будзе затрачана 306000 руб. Апрача таго, праз школы малапісьменных будзе прапушчана 4300 чал.

Большую частку грошай адпускае Наркамасьветы, а рэшта—з сум саюзу і міжпрафсаюзнага фонду.

Абсьледваньне фізкультурнае працы на буйных прадпрыемствах.

Прэзыдыум ВСФК Беларусі пастанавіў у лістападзе м-ца бягучага году правесьці абсьледваньне фізкультурнай працы на фабрыках „Герой Працы" (Добруш), гарбарні „Бальшавік" (Менск) і гуце „Домбаль"—(Барысаў).

У кастрычніку м-цу будзе праведзен агляд фізкультурнае працы ў Полацкай акругі.

Дзе кепска з падпіскай

Вельмі кепска праведзена кампанія па падпісцы на 3-ю пазыку індустрыялізацыі сярод рабочых 1 і 2-га цэгляных заводаў Менску, дзе сума падпіскі не правышае 15-20 проц. агульнай заработнай платы. Кепска таксама стаіць справа з рэалізацыяй пазыкі сярод рабочых-будаўнікоў Белдзяржстрою і Гандльстрою, а сярод рабочых-сезоннікаў Вадаканалу амаль зусім не праведзена праца па падпісцы на пазыку.

Адчыняюцца фабзавучы швэйнікаў.

ВСНГБел. запрапанаваў швэйтрэсту адчыніць школы фабзавуча ў Віцебску не пазьней 15 кастрычніка, а ў Менску—не пазьней 1 лістапада бягучага году.

Падрыхтоўка да зімовага спартыўнага сэзону.

Прэзыдыум ЦСПСБ адпусьціў 10764 р. на абсталяваньне зімовага катка па спортпляцоўцы саду „Прафінтэрн". Будзе пабудаваны спэцыяльны павільён-цяплушка, набываецца 150 пар лыж, 40 пар канькоў, з іх—10 пар бегавых 25 пар жаночых і мужчынскіх камаш для канькоў і інш.

НОВЫЯ КНІГІ.

Паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кнігі і часопісі.

1. „Вялікі ўраджай праз мінэральныя ўгнаеньні" С. Тупяневіч. Сялянская бібліятэка № 138. Стар. 35, цана 10 кап.
2. „Матыліца ў свойскае мывёлы" С. Серпаў. Стар. 23, цана 8 кап.
3. „Што пастанавіў XII зьезд КП(б)Б аб пяцігадовым пляне народнае гаспадаркі і культуры БССР" Стрэле. Стар. 80, цана 25 кап. Выданьне Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.
4. Молодняк № 8. Літаратурна-мастацкі і грамадзка-палітычны журнал-месячнік. Стар. 119, цана 50 кап. Орган ЦК ЛКСМБ Украіны.

Калгасы да Дню ўраджаю і калектывізацыі

Азнаёміць працоўнае сялянства з дасягненьнямі калгаснага будаўніцтва.

У сувязі з надыходам Усесаюзнага „дню калектывізацыі" Белкалгассаюзам распрацованы плян яго правядзеньня па калгасах Беларусі.

Ва ўсіх калгасах непасрэдна праводзіцца сьвята „Дню ўраджаю і калектывізацыі" з прыцягненьнем шырокіх мас бедняцка-серадняцкага насельніцтва.

Калгасы, якія прымаюць удзел у с.-г. райённых выстаўках і конкурсах павінны вылучаць асобных прадстаўнікоў для ўдзелу праздзеньня выставак.

Сьвята ў калгасах пачынаецца пасяджэньнем с.-г. вытворчай нарады з шырокім удзелам, як саміх калгаснікаў, так і бедняцка-серадняцкай часткі ваколічных вёсак і пасёлкаў. На вытворчых нарадах праводзяцца даклады аб 5-цігадовым пляне разьвіцьця народнае гаспадаркі, аб становішчы і задачах калгаснага руху, аб выкананьні заданьняў па аграмінімуму і г. д. Апрача таго, на нарадах будзе праводзіцца ацэнка працы паасобных членаў калгасаў і прэміраваньне найлепшых працаўнікоў.

На пасяджэньнях вытворчых нарад арганізоўваецца праверка фактычнага выкананьня калгасамі дагавораў па цыялістычнаму спаборніцтву, а таксама—заключэньне новых дагавароў.

У дзень калектывізацыі будуць праведзены масавыя экскурсіі працоўнага сялянства ў калгасы дзеля азнаямленьня канкрэтнымі дасягненьнямі калгаснага будаўніцтва.

Увечары ў калгасах наладжваюцца станоўкі спэктакляў, агра-судоў, інсцэровак і г. д.

Згодна паказаньню Белкалгассаюзу ламі калгасьнікаў павінны быць праведзены ня менш чым 2 вытворчых суботні для аказаньня дапамогі слабейшым калгасам і вясковай беднаце шляхам арганізацыі палёў організацыі рамонту с.-г. інвэнтару, ачыстцы насеньня і інш.

Да сьвята прыстасоўваецца арганізацыя калгасна-агранамічных і сельска-гаспадарчых гурткоў, а таксама адчыненьне ў калгасах культурна-бытавых устаноў (школ, ясьляў, сталовак).

Па хатах-чытальнях, калгасах і школах выпушчаюцца спэцыяльныя нумары насценгазэт.

Зямельныя органы—да дню ўраджаю і калектывізацыі.

За сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі.

НКЗ Беларусі распрацаваў шэраг мерапрыёмстваў па ўдзелу зямельных органаў у правядзеньні „дню ўраджаю і калектывізацыі".

Па ўсёй Беларусі будзе арганізаваны збор і апрацоўка матар'ялаў аб становішчы сельскай гаспадаркі БССР і асобных яе галін. Разам з калгассаюзамі наладжваецца збор матар'ялу і асобных экспанатаў па калгасах, савгасах, якія будуць скарыстаны для дэманстраваньня найлепшых прыкладаў сацыялістычных гаспадарак.

Па лініі НКЗ будуць праведзены спэцыяльныя даклады прадстаўнікоў зямельных органаў прысьвечаныя дню ўраджаю і калектывізацыі, дзе шырока ня вінны асьвятляцца дасягненьні ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Раённыя дасьледчыя станцыі арганізоўваюць перасовачныя с.-г. выстаўкі, які будуць паказваць дасягненьні дасьледчых станцый. Перасовачныя выстаўкі разьлічаны на 2-3 дні і будуць наладжваць выезды ў бліжэйшыя раёны. Праз перасовачныя выстаўкі будзе праведзена масавая агра-прапаганда.

Лепшую „прэмію" за аграпрапаганду—Барысаўскаму РВК.

Што супольнага паміж Барысаўскім РВК і аграпрапагандай, ці лепш кажучы, аграноміяй? Абсалютна нічога супольнага, бо дзе-ж гэта бачылі, каб РВК пачаў займацца ўсялякай дробязьзю! Калі вы спытаеце райённага агранома, як праходзіць сяўба ў райёне, ён панура адкажа:

— Пачакайце крыху, пашукаю ў паперах, бо сам я мала выяжджаю на райён...

Вы зьдзіўлена слухаеце:—Бачыце,—гаворыць далей пануры чалавек,—наш РВК даручае мне інш. заданьні...

— Прабачайце,—ня сьмела адважваецеся вы,—як-жа ў вас пытаньне з сяўбой? У вас напэўна, увесь апарат заняты зараз гэтай кампаніяй, агранамічны пэрсанал забясьпечаны перасовачнымі сродкамі.

Мы не атрымалі адказу ад панурага чалавека, але даведаліся вось што:

Нягледзячы на тое, што ёсьць спэцыяльная пастанова СНК (абежнік ад 22-8—29 г.) аб забясьпечаньні аграпэрсаналу патрэбнымі перавозачнымі сродкамі, кватэрамі, аб выкарыстоўваньні агрономаў толькі па спэцыяльнасьці і г. д.—у Барысаўскім р. якраз робіцца ўсё наадварот.

Райённы агроном ня можа выяжджаць на райён, бо мае зусім інш. занятки: выконвае канцэлярскую працу, а ў вольны час пасе каня, бо РВК не адпускае сродкаў на ўтрыманьне каня.

— Будзе карысьць ад сяўбы, ці ня будзе,—разважае Барысаўскі РВК,—а вось, скараціўшы выдаткі на ўтрыманьне каня, напэўна, будзе карысьць для РВК. Але „ашчаднасьць" Барысаўскага РВК ідзе значна далей: за ўвесь бюджэтны год вучастковыя агрономы не атрымалі ні капейкі на наём кватэры.

Вучастковыя агрономы ходзяць пехатой, бо РВК не адпускае сродкаў на паездкі.

На выплату пэнсіі 7 агрономам за верасень замест 580 руб. выдана... 13 руб. 33 кап.

Замест арганізатара: кіраўніка сельскай гаспадаркі агрономы сядзяць у канцэлярыях, выконваючы абавязкі канцэлярыста.

За ўвесь час пасеўнай кампаніі райённы агроном быў усяго 2 разы на райёне, бо загружан інш. працай.

Тым часам Барысаўскі раён ня можа пахваліцца вялікімі дасягненьнямі на фронце сяўбы: калектывізацыя праходзіць слаба. і асабліва дрэнна стаіць абслугоўваньне існуючых калгасаў, абмен насеньня зрываецца, зерноачышчэньне выканана толькі напалову.

Але РВК аб гэтым мала дбае.

СУД.

Расправа кулака з сынам.

(Хут. Мазуры, Самахвалаўск. р-ну.

Сямейныя абставіны, у якіх жыў Уладзімер Баўдзей, былі надта цяжкія: бацька Язэп Адамаў Баўдзей, 67 год, чалавек з старым дарэвалюцыйным закалам, меў кулацкую гаспадарку, шмат жывёлы, але дзеці хадзілі заўсёды босыя ці ў лапцях. З таго часу, як Уладзімер стаў хадзіць у хату-чытальню, чытаць газэту „бязбожнік" і ажаніўся на беднай сялянцы, адносіны бацькі да яго вельмі пагоршыліся.

Жыў Язэп Баўдзей з сынам, як сабака з катом. Заўсёды паміж імі адбываліся спрэчкі, лаянка, асабліва пасьля таго, як Уладзімер стаў дамагацца падзелу хутару, наогул маёмасьці.

Мой хутар, мая зямля, крычаў Язэп,—нічога ня дам. Няхай бальшавікі табе дадуць зямлі!

Уладзімер знасіў усе зьдзекі і крыкі бацькі, працаваў на гаспадарцы, як чорны вол, аднак, канчаткова рашыў дабіцца падзелу хутару і іншай маёмасьці.

9 чэрвеня г. г. Язэп і Уладзімер былі па справах у м. Койданаве; Уладзімер вярнуўся дахаты раней бацькі, пагуляў на вечарынцы і пашоў спаць у гумно.

Увечары з Койданава вярнуўся Язэп Баўдзей пад добрай „мухай". Павячэраўшы, ён выйшаў на вуліцу. Кроў кіпела ў яго жылах. У галаве стаяла адна думка: забіць сына і не дапусьціць падзелу маёмасьці.

Ноччу, калі Уладзімер спаў, бацька—Язэп Баўдзей, узброіўшыся дубовым калом, накіраваўся ў гумно і некалькі раз выцяў сына калом па галаве, ад чаго ён адразу і памёр.

Зачыніўшы дзьверы гумна, Язэп Баўдзей захаваў у салому кол, прышоў дахаты і лёг спаць.

Народны суд Самахвалаўскага райёну прыгаварыў Язэпа Баўдзея на восем гоз зьняволеньня з суровым адмежаваньнем і пазбаўленьнем у правох на два гады па адбыцьці пакаранья.

Д. К.

Апавяшчэньні.

Габінэт паліт-асьветпрацы.

21-IX у 1 г. дню адбудзецца сход загадчыкаў вячэрніх школ павышанага тыпу. Прысутнасьць абавязкова.

23-IX у 1 г. дню пасяджэньне камісіі па разгляду праграм вяч. школ 1-ае ступені. Выклікаюцца т. т. Айзенбэрг, Сеўрук А., Родаў, Харкевіч.

Прысутнасьць абавязкова.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР—КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.
ПРАДАПОШНІ СПЭКТАКЛЬ.
ГАСТРОЛІ МУЗЫЧНАЙ КАМЭДЫІ
Субота, 21-га верасьня.
„Черный амулет" у 3-х дзеях, СТРЭЛЬНІКАВА
Пачатак а 8 з пал. гадзіне.

1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР".
Ад панядзелка 16-га верасьня
Гістарычны фільм з эпохі Пугачоўшчыны на Руі.
БУЛАТ-БАТЫР
У 7 ЧАСТКАХ.
Кіно адчынена штодня ад 2 гадз. дню. Пачатак 1-га сэансу а 3 гадз. 30 хв., 2-га а 5 гадз.
ПА НЯДЗЕЛЯХ кіно адчынена ад 12 гадз. дню
Цана білету 10 кап.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА".
Новая праграма.
I.
Джэнтльмэн і певень
камэдыя ў 6 частках.
II.
Бунт зубоў
у 2-х частках.
Пачатак а 7 гадз.)—(Каса ад 5 гадз.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».
Ад панядзелка 16-га верасьня.
— МАСТАЦКІ БЫТАВЫ ФІЛЬМ —
„ПЕРЕГОН СМЕРТИ".
Драма ў 6 частках.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ
АД ПАНЯДЗЕЛКА